

СТРАЧАНЫЯ НА БЕРАГАХ СОЖА

8

ТРОХВУГОЛЬНАЯ, АДЗІНАЯ Ў БЕЛАРУСІ

12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ВЕРАСНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 181 (29550)


# Сямейная талака



На бульбяных сотках жыхаркі вёскі Бор Навагрудскага раёна Тамары ГІРЫС дружна і аператыўна выкапаны ўраджай другога хлеба. І зусім невыпадкова — жанчыне дапамагалі працавітыя і ўвішныя браты Юрый і Аляксандр ВЕЕЎНІКІ.

Кожны год родныя Тамары Пятроўны дапамагаюць адно аднаму, асабліва калі прыходзіць час садзіць або капаць бульбу.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Прыняты нацыянальны план вакцынацыі. Падкрэсліваю, што мы гэтую работу вядзём вельмі кропкава, прадметна і настойліва просім і рэкамендуем людзям вакцынавацца. На сёння больш за 1,8 млн нашых грамадзян вакцынаваны першым кампанентам «Спадарожніка V» і кітайскай вакцынай «Сінафарм». І 1,5 млн беларусаў вакцынаваны другім кампанентам. Літаральна некалькі тыдняў таму мы атрымалі вакцыну «Спадарожнік Лайт». Плануем вакцынаваць нашых студэнтаў, паколькі тэндэнцыі такія, што гэтая інфекцыя сапраўды па ўзроставых параметрах спускаецца ўсё ніжэй і ніжэй. І нам трэба супрацьпаставіць і абараніць у тым ліку нашых маладых людзей і нашых дзяцей».*

Медыцына: сучасны падыход

## НАСУПЕРАК ПАНДЭМІІ

### Як развіваюцца новыя тэхналогіі ў анкалогіі, транспланталогіі і нейрахірургіі

**Нягледзячы на няпросты пандэмічны час для медыцыны ва ўсім свеце, спецыялізаваныя беларускія клінікі аказвалі дапамогу і рабілі высокатэхналагічныя аперацыі ў такіх галінах, як анкалогія, транспланталогія, нейрахірургія, кардыялогія, траўматалогія і артапедыя. Калі бальніцы і аддзяленні перапрафілёўваліся пад ковідныя ў раённых цэнтрах і абласных гарадах, то неабходная спецыялізаваная дапамога найлепшымі ў сваіх сферах урачамі аказвалася ў сталіцы — у рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтрах, куды пацыенты прыязджалі з усёй краіны. Акрамя таго, нягледзячы на вымушанае скарачэнне міжнародных кантактаў, РНПЦ працягвалі навуковыя даследаванні, у тым ліку і ў рамках сумесных з замежнымі клінікамі праектаў.**

**Як падчас пандэміі выконваліся аперацыі па перасадцы органаў? Чаму ў перыяд распаўсюджання каранавіруса зменшылася колькасць анкалагічных захворванняў? Які прарыў стаў магчымым дзякуючы беларуска-амерыканскай распрацоўцы вакцыны ад раку? Пра гэта і іншае расказалі вядомыя беларускія ўрачы — трансплантолаг дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургії, транспланталогіі і гематалогіі Алег РУМО, анколаг намеснік дырэктара па навуковай рабоце Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Сяргей КРАСНЫ, нейрахірург намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Эдуард ВАСІЛЕВІЧ.**

СТАР. 5

Квадратны метр

## МЕСЯЦ АКТЫЎНЫХ ПРОДАЖАЎ — І ТАННЫХ КВАТЭР УЖО НЯМА

### У сталіцы ў жніўні амаль цалкам скупілі ўсё бюджэтнае жыллё

**На думку нашага эксперта, ганаровага старшыні Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», дырэктара агенцтва нерухомасці Мікалая ПРАСТАЛУПАВА, практычна за апошні месяц лета ў Мінску адбылася мэтанакіраваная скупка недарагіх кватэр.**

СТАР. 7



## КОРАТКА

• Беларусь да канца года плануе прыняць дзве паўторныя місіі МАГАТЭ.

• **Пацыентам дзіцячай бальніцы ў Гродне перадалі каравай са збожжа новага ўраджаю.**





• Беларускія вайскоўцы ўдзельнічаюць у антытэрарыстычным вучэнні ШАС «Мірная місія — 2021».

• **Мужчына пры будаўніцтве дома ў Гродзенскім раёне выявіў астанкі двух чалавек.**

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2021 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

З першых вуснаў

# «Калі мы хочам падтрымкі з боку насельніцтва, беларускага народа, неабходна працаваць з народам»

## Робячы кадравыя назначэнні, Прэзідэнт закрануў і тэму змен у Канстытуцыі

**Учора кіраўнік краіны прыняў шэраг кадравых рашэнняў.**

Прэзідэнт прызначыў паслом у Таджыкістан Віктара Дзенісенку, паслом у Бразілію Сяргея Лукашэвіча, а ў Рэспубліку Карэя — Андрэя Чарнецкага. Старшынёй Камянецкага райвыканкама прызначаны Віталь Кулак, старшынёй Жабінкаўскага райвыканкама — Вадзім Краўчук, старшынёй Касцюковіцкага райвыканкама — Аляксандра Міхеенка, кіраўніком адміністрацыі Першамайскага раёна Віцебска — Яўген Сямёнычаў. Кампанію «Мабільныя ТэлеСістэмы» узначаліць Уладзіслаў Андрэйчанка.

У рабочым парадку Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў на пасаду першага намесніка міністра культуры Валерыя Грамаду; намеснікам міністра культуры — Сяргея Саракача, першым намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны — Наталлю Паўлючэнку, кіруючым Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва — Юлію Берднікаву, дырэктарам Дэпартамента па ядзернай энергетыцы Міністэрства энергетыкі — Аляксея Дзербіна, дырэктарам рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Педагагічная прэса» — Кацярыну Дубінскую, членамі Віцебскага аблвыканкама — Мікалая Арлова і Уладзіміра Бабічава.

### АД АЗІІ ДА АМЕРЫКІ

Аляксандр Лукашэнка пры назначэнні паслоў адзначыў міністру замежных спраў Уладзіміру Макею, што памыляцца з кандыдатурамі нельга. Міністр адказаў: абмяркоўвалі адказна, некалькі раўндаў было сустрэч з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта, прэм'ер-міністрам.

«Што датычыцца Таджыкістана. Гэта не проста сяброўская краіна. Там будуць створаны ўсе ўмовы для работы. І з Прэзідэнтам мы падтрымліваем сяброўскія адносіны, прычым даўнія. У нас няма практычна сакрэтаў адзін ад аднаго. Гэта паказаў і апошні трохдзённы візіт. Вам будзе з гэтай краінай лёгка працаваць. Узровень патэнцыялу па гандлі там вельмі высокі. Там ёсць за кошт якіх кірункаў дадаваць», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што галоўная задача для любога пасла — гандлёва-эканамічныя адносіны. У палітычным плане з краінамі, куды назначаюцца дыпламаты, праблем няма. «Бразілія — вялікая дзяржава, магутная. Нам неабходна пашыраць сваю прысутнасць там. Хоць бы патроху. Я маю на ўвазе гандлёва-эканамічныя адносіны. У палітыцы будзеце бачыць, наколькі гэта магчыма. МЗС павінен дапамагчы праз Расію, праз БРІКС», — мяркуе кіраўнік краіны. Па яго словах, Расія можа аказаць падтрымку ў прасоўванні нашых інтарэсаў асабліва цяпер, у санкцыйны перыяд для двух дзяржаў.

«Што датычыцца Карэі, з імі трэба сапраўды супрацоўнічаць. Цяпер трэба каб разам з МЗС скааперавалiся і вызначылі асноўныя напрамкі нашага супрацоўніцтва. Яны ідуць насустрач. Ім цікавая гэтая велізарная пляцоўка ў цэнтры Еўропы. Таму трэба падтрымліваць з імі адносіны», — адзначыў Прэзідэнт.

### ПРА РЭФЕРЭНДУМ І СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ

Прэзідэнт сваю размову з новымі прадстаўнікамі вертыкалі ўлады пачаў з таго, што нагадаў пра будучы рэферэндум. Менавіта кіраўнікам на месцах неабходна будзе тлумачыць людзям, якія змены чакаць.

***«Мы проста людзям раскажам, якія змены нас чакаюць у сувязі з Канстытуцыяй***, каб нас не папракнулі, што мы ўтрымліваем уладу пасінелымі рукамі і пад сябе робім гэту Канстытуцыю. ***Ніхто пад сябе нічога рабіць не збіраецца — як абяцалі, так і праводзім рэферэндум. Арганізаваць рэферэндум — наша задача, усіх, хто за гэтым сталом. Ва ўсіх будуць розныя функцыі, але мэта адна***», — заўважыў Прэзідэнт.

Акрамя гэтага, ён звяртае ўвагу на неабходнасць працаваць з людзьмі на месцы.

***«Калі мы хочам падтрымкі з боку насельніцтва, беларускага народа, неабходна працаваць з народам.*** Такія вось задачы», — заўважыў кіраўнік краіны.

Паводле яго слоў, няпросты быў год для сельскай гаспадаркі, а ўсе кіраўнікі райвыканкамаў павінны ёй удзяляць асаблівую ўвагу. Аляксандр Лукашэнка падкрэслівае, што і восень падкінула праблем у выглядзе дажджоў, а ўраджай кукурузы яшчэ не сабраны.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, ні па адной з культур няма праблем з дзяржзаказам — ён практычна выкананы.

***«Дзяржава і людзі будуць забяспечаны збожжам у неабходнай колькасці***. Галоўнае цяпер — паглядзець, што неабходна жывёлагадоўлі», — акцэнтуе Прэзідэнт.

Ён падкрэслівае, што для птушка- і свінагадоўлі патрэбна для кармлення зерне кукурузы. У гадоўлі буйной рагатай жывёлы неабходна глядзець, як лепш у кожным канкрэтным выпадку: ці сілас у траншэю пакласці, ці нарыхтаваць зерне, закансерваваўшы яго ў рукаў.

«Галоўнае, каб быў парадак і дысцыпліна. Нічога нельга страціць», — сказаў Прэзідэнт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ**

**Сяргей ЛУКАШЭВІЧ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Бразіліі,** заўважыў, што гэта краіна — лакаматыў супрацоўніцтва з Беларуссю ў Лацінскай Амерыцы. Бразілія ўваходзіць у дваццатку найбуйнейшых партнёраў нашай дзяржавы па тавараабароце.

«Наша прысутнасць у Лацінскай Амерыцы не такога шырокага плана, як у іншых краінах. Але яна не менш важная ў сувязі з палітыкай узмацнення супрацоўніцтва з краінамі далёкай дугі. Прэзідэнт адзначыў на сустрэчы неабходнасць пашырэння нашай прысутнасці, і мы падумаем, як гэта рэалізаваць. Вельмі важна, што настрой пасольства — на работу з беларускімі прадпрыемствамі. Мы павінны паглядзець на тыя нішы, на тыя магчымасці, што Беларусь можа адкрыць на гэтым буйным і ёмістым рынку», — падкрэсліў Сяргей Лукашэвіч.

**Віктар ДЗЕНІСЕНКА, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Таджыкістане,** адзначыў, што галоўны прыярытэт у айчыннай дыпламатыі — эканамічны. Па сумяшчальніцтве пасол будзе працаваць і з Афганістанам. «Па мінулым годзе ў нас тавараабарот з Афганістанам склаў больш чым 181 мільён долараў. Гэта добры паказчык. Я думаю, гэты ўзровень неабходна трымаць. Зразумела, што сітуацыя ўнутрыпалітычная ў Афганістане складаная, але будзе ісці пошук больш прымальнага механізму супрацоўніцтва і для нас, і для афганскага боку. Будзем спадзявацца на нармалізацыю сітуацыі», — канстатаваў кіраўнік дыпламатычнай місіі.

**Дырэктар кампаніі «Мабільныя ТэлеСістэмы» Уладзіслаў АНДРЭЙЧАНКА** расказаў, што асноўнай місіяй кампаніі, 51 % актываў якой належаць дзяржаве, будзе захаванне інфармацыйнай бяспекі. Таксама МТС плануе нарошчваць тэхналагічнасць дзейнасці, хуткасць інтэрнэту, распрацоўваць новыя прадукты.

«На першы план у нас выходзіць карысць для грамадства, кліентаў, рост вытворчасці працы ўнутры кампаніі, каб не забываць пра сваіх супрацоўнікаў, каб у нас было цікава працаваць», — сказаў Уладзіслаў Андрэйчанка.

Ён нагадаў, што некалькі разоў у СМІ вяліся размовы аб продажы дзяржаўнай долі кампаніі, але сёння рана прагназаваць такую магчымасць.

**Старшыня Камянецкага райвыканкама Віталь КУЛАК** звярнуў увагу журналістаў на тую тлумачальную работу па зменах Канстытуцыі, якой будзе займацца на новай пасадзе.

«Нашы людзі гатовы слухаць і чуць. Мы рэгулярна праводзім сустрэчы ў працоўных калектывах. Яны праходзяць актыўна. Нашы грамадзяне цікавяцца, задаюць пытанні па развіцці канкрэтнага рэгіёна і ў цэлым развіцці краіны», — дадаў ён.

Другая задача для мясцовай улады — сельская гаспадарка, праца ў гэтым сектары не скончылася з уборкай збожжа.

«Сельскагаспадарчы год працягваецца. Уборачная кампанія збожжавых завершана. Наперадзе — не менш важная работа па ўборцы кукурузы і сяўбе азімых культур. Канешне, стрымліваюць умовы надвор'я. Але прымаецца шэраг тэхналагічных мер, што дазваляюць у аптымальныя тэрміны правесці работы», — падкрэсліў Віталь Кулак.

# «Мы вельмі хочам, каб Малдова заставалася сяброўскай, суверэннай, незалежнай дзяржавай»

## Прэзідэнт сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Малдовы Віктарам Сарачанам з нагоды заканчэння яго кадэнцыі

**«Вы былі добрым пасам сваёй краіны. Павінен шчыра гэта сказаць і вельмі спадзяюся, што наступны пасол горшым не будзе. Вы не толькі падтрымлівалі сяброўскія адносіны нашых краін (што ўваходзіць у абавязкі сапраўднага пасла), але і ў асабістым і дзяржаўным плане заўсёды імкнуліся душой і сэрцам, каб малдаване і беларусы былі побач», — сказаў Прэзідэнт.**

Па яго словах, шмат было зроблена паслом для нарошчвання тавараабароту двух краін.

«Гэта аснова. Вы павінны ведаць, што мы заўсёды будзем прытрымлівацца цеснага сяброўства беларусаў і малдаван. Мы вельмі хочам, каб Малдова заставалася сяброўскай, суверэннай, незалежнай дзяржавай і паступова вырашала свае праблемы», — дадаў кіраўнік краіны.

Ён заўважыў: у Малдовы пасля распаду Савецкага Саюза былі няпростыя часы, але за апошнія гады зроблена нямала, каб краіна вызначылася, дзе яе інтарэсы і ў якім кірунку развівацца далей.

«У гэтым плане Ігар Дадон (былы Прэзідэнт Малдовы. — **«Зв.»**) зрабіў нямала. Трэба сказаць, прыйшла новая ўлада, да кіраўніцтва краіны прыйшлі новыя людзі. Я ўпэўнены, што яны вымушаны будуць (калі нехта там мяркуе па-іншаму, у адваротным кірунку, як я кажу) праводзіць палітыку ў інтарэсах Малдовы. Інтарэсы кіраўніцтва перадусім павінны быць такімі», — канстатуе Аляксандр Лукашэнка.

Малдову ў размове з паслом кіраўнік краіны назваў жамчужынай Еўропы, да якой ён заўсёды ставіўся з любоўю.

«І я бачу развіццё Малдовы як суверэннай незалежнай дзяржавы. У гэтым ёсць інтарэс народа. Не думаю, што знойдзецца палітык, які б праводзіў іншую палітыку. Народ не дазволіць праводзіць палітыку на згортванне суверэнітэту і незалежнасці. Няхай гэта невялікі народ, але з вельмі вялікімі палітычнымі амбіцыямі на незалежнасць сваёй дзяржавы. І ў гэтым плане мы заўсёды будзем на вашым баку», — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Ён заявіў, што Беларусь спажывае вялікія аб'ёмы малдаўскай прадукцыі і далей будзе так рабіць, калі гэта выгадна краіне-партнёру. Прэзідэнт падкрэслівае, што і Беларусь экспартуе неабходныя Малдове тавары — аўтамабілі, механізмы, трактары, тралейбусы.

«Тое, што вы прасілі. Вы ведаеце, я сам бываў на сумесных прадпрыемствах, адкрываў іх, прымаў рашэнні разам з уладамі апошняга часу. Таму ў гэтым кірунку мы будзем дзейнічаць. Вы для нас заўсёды застанецеся добрым сябрам, і мы гатовы выкарыстаць вашы сувязі для ўзмацнення гэтага сяброўства», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Віктар САРАЧАН** акцэнтуе, што за час яго працы ў нашай дзяржаве адбылося пераасэнсаванне адносін двух краін, і Беларусь заўсёды па-сяброўску адносілася да Малдовы.

«Мы адчуваем сяброўскі, бацькоўскі клопат пра нашу краіну. Мы вельмі цэнім той вопыт, што ёсць сёння ў Беларусі. У нас створана нямала сумесных прадпрыемстваў. У нас працуе сёння 90 пагадненняў і трактатаў, што заключаны паміж Малдовай і Беларуссю», — сказаў Віктар Сарачан, выказаўшы ўпэўненасць, што гэта ўсё будзе мець працяг і надалей.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Слова дэпутата

# «БЕЗ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ ЖЫЦЦЁ СТРАЧВАЕ СЭНС»

**Святлана АДЗІНЦОВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы:**



— Дзень народнага адзінства — вельмі важнае свята. Як і абвяшчэнне Года народнага адзінства, яно падкрэслівае: мы адзіныя ў памкненні захавання міру на зямлі. Мы, беларусы, маем дзяржаўнасць, незалежнасць, родную зямлю. І мы павінны быць адзіныя ў памкненні захаваць гэта для нашых дзяцей, для будучыні ў час глабалізацыі. Нельга паўтараць сумны вопыт краін, дзе ў выніку каляровых рэвалюцый жыццё простых людзей пагоршылася і ад суверэнітэту мала што засталося.

Без міру, дабрыні, чалавечнасці жыццё страчвае сэнс. Не стамлюся паўтараць, што толькі ўсе разам, як кажуць беларусы, талакой — добрымі ўчынкамі, працай — зможам зберагчы Радзіму. Яе можна параўнаць з дзіцем, з прыгожай кветкай, нечым чароўным, што пры любым неасцярожным дзеянні вельмі лёгка загубіць. Наш свет сапраўды крохкі. Мы павінны перадаць нашчадкам мірнае неба, магчымасць жыць у краіне, дзе ёсць усё для самарэалізацыі.

У Дзень народнага адзінства трэба задумацца: заўтра залежыць ад таго, што мы робім сёння.

***Запісаў Аляксандр ПУКШАНСКІ.***

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Кралевіч Ірыне Мікалаеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МУЖА.**

На слыху

Дзмітрый ПІНЕВІЧ:

# «У РЭАНІМАЦЫІ ВАКЦЫНАВАНЫХ АМАЛЬ НЯМА»

## Міністр аховы здароўя пра чацвёртую хвалю COVID-19 і прышчэпкі

**Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч заклікаў беларусаў актыўней вакцынавацца супраць COVID-19, паколькі ў краіну прыйшла чацвёртая хваля захворвання. У апошнія дні лічбы захварэлых знаходзяцца на самым піку за ўсе паўтара года распаўсюджання каранавіруснай інфекцыі. Трэць бальнічнага ложкавага фонду ўжо перапрафілявана пад хворых на COVID-19.**

— Чацвёртую хвалю мы ўжо анансавалі: паводле прагнозаў, яна павінна была прыйсці. На жаль, халоднае надвор'е спрыяе росту захворвання. Зараз мы знаходзімся амаль на самых высокіх лічбах мінулых хваль. Складанасць у тым, што гэтыя лічбы паўтараюцца з дня ў дзень, у тым ліку па шпіталізацыі. Надзвычайнай сітуацыі няма, але патрабуецца напружанне сіл сістэмы аховы здароўя, — сказаў міністр учора падчас наведвання 10-й клінічнай бальніцы Мінска.

Як паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя, гэта адна з вядучых устаноў краіны, якая мае вялікі вопыт лячэння COVID-19. За лета тут павялічылася колькасць кіслародных пунктаў, разгорнута вялікая колькасць блокаў інтэнсіўнай тэрапіі.

— Асноўная мэта майго наведвання — хачу «зверыць гадзіннікі» са спецыялістамі: даведацца, як працуюць новыя пратаколы, ці ёсць перабоі з пастаўкамі медыкаментаў, матэрыялаў, і падзякаваць калегам за працу, — сказаў міністр.

Дарэчы, са 100 тысяч ложкаў, якія ёсць у краіне, амаль трэць ужо перапрафілявана пад ковід. Асноўная частка з іх пакуль пустуе. Аднак калі беларусы і далей будуць бяспечна ставіцца да ўласнага здароўя — грэбаваць мерамі бяспекі і ігнараваць прышчэпкі, — сітуацыя можа хутка пагоршыцца.

— Я паглядзеў цяжкіх пацыентаў у рэанімацыі і ў аддзяленнях — вакцынаваных людзей практычна няма. Калі гутару з пацыентамі, пытаюся, чаму яны не вакцынаваны — «спадзяваўся на авось» гучыць ад кожнага, хто знаходзіцца на рэанімацыйным або інфекцыйным ложку бальніцы, і мяне гэта моцна засмучае. На сёння вельмі актуальная тэма ўсвядомленага прыходу да вакцынацыі: калі ты вакцынуешся, то абараняеш не толькі і не столькі сябе — ты абараняеш сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў. Ты ўносіш лепту ў перамогу над пандэміяй. Карыстаючыся выпадкам, яшчэ раз усіх заклікаю зрабіць свядомы выбар: вакцын шмат, яны розныя, мы чакаем усіх на прышчэпачных пунктах.

Нагадаем, у Беларусі прышчапляюць расійска-беларускім «Спадарожнікам», кітайскай вакцынай. Аднакампанентны «Спадарожнік Лайт» паступае ў рэгіёны. Паводле слоў Дзмітрыя Піневіча, вядуцца перагаворы па Pfizer.

— Я папрасіў тураператараў правесці сацапытанне, колькі чалавек хочуць ім прышчапіцца, — адсюль і будзем рабіць высновы.

**Алена КРАВЕЦ.**

Шок

# СМЕРЦЬ НА ГРАНІЦЫ

## Труп жанчыны знойдзены на ўчастку беларуска-польскай граніцы ў Гродзенскім раёне каля вёскі Лясное, паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце

**Паводле папярэдняй інфармацыі, яе з групай іншых мігрантаў выпхнулі з польскага боку. «Цела жанчыны неславянскай знешнасці было выяўлена за метр ад беларуска-польскай граніцы 19 верасня. Паблізу месца на кантрольна-следавай паласе, абсталяванай на польскай тэрыторыі, зафіксаваныя відавочныя прыкметы валачэння цела з боку Рэспублікі Польшча ў Беларусь», — распавёў часова выконваючы абавязкі начальніка пагранічнай заставы «Усава» Яўген ОМЕСЬ.**

Побач з загінулай былі трое дзяцей, а таксама мужчына і пажылая жанчына. Усе яны грамадзяне Ірака. Дзецям цяпер аказваецца неабходная псіхалагічная і медыцынская дапамога. Мужчына распавёў, што жонцы было 39 гадоў. Яны з дзецьмі беглі з Ірака ў пошуках месца для лепшага жыцця. Думалі знайсці яго ў Еўрасаюзе. Накіроўваліся ў Германію і ўжо змаглі дайсці да найбліжэйшай польскай вёскі. Жонка і дзеці стаміліся. Спрабавалі сагрэцца каля вогнішча, высушыць вопратку і абутак. Хацелі піць. Муж папрасіў у польскага жыхара вады, але той паведаміў пра мігрантаў вартавым граніцы. Да сям'і тут жа прыехалі польскія пагранічнікі і, не даўшы ім абуцца і апрануцца, сталі гнаць басаног да беларускай граніцы. «Маёй жонцы было дрэнна, у яе ціск. Яна была вельмі стомленая, вельмі павольна ішла. І адзін польскі салдат надзеў пальчаткі, на іх быў метал. І яе вельмі моцна штурхнуў. Яна ўпала. Калі я паглядзеў на жонку, яна была ў шоку і не магла рухацца — проста адкрытыя вочы і нават не магла дыхаць...» — распавёў грамадзянін Ірака.

Як паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце, для забеспячэння празрыстасці расследавання і даступнасці інфармацыі на месца запрошаны прадстаўнікі Упраўлення вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Беларусі і Міжнароднай арганізацыі па міграцыі.

Гэты жудасны выпадак з'яўляецца яскравым доказам гестапаўскіх метадаў польскіх улад. Такім меркаваннем з карэспандэнтам БелТА падзяліўся **загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай ШЧОКІН**. Паводле слоў Мікалая Шчокіна, праменее выступленне Прэзідэнта Беларусі на саміце АДКБ адносна палітыкі Еўрапейскага саюза і яе вынікаў, а таксама лёсу народа Афганістана зрабіла эфект бомбы, якая разарвалася, стала псіхалагічным шокам для многіх заходніх краін. «Прэзідэнт у дэталях і адкрыта апісаў сітуацыю, яе наступствы, раскрыў сваё бачанне і прапанаваў мадэль сістэмнай інтэграцыйнай работы па стварэнні комплексу мер у процістаянні калектыўнаму Захаду і мінімізацыі наступстваў палітыкі ЗША. Больш за тое, Аляксандр Лукашэнка выкрыў злачынныя дзеянні калектыўнага Захаду і на прыкладзе гібрыднай агрэсіі Польшчы, Літвы і Латвіі ў выглядзе міжнароднай пагрозы бежанцам і апісаў рэальную карціну таго, што адбываецца на граніцах АДКБ. Знойдзены 19 верасня на беларуска-польскай граніцы труп жанчыны і некалькі мёртвых цел на тэрыторыі Польшчы з'яўляюцца яскравым доказам слоў Прэзідэнта аб гестапаўскіх метадах польскіх улад», — заявіў эксперт. Ён упэўнены, што выкарыстанне новых падраздзяленняў НАТА для барацьбы з бежанцамі ў прынцыпе выходзіць за рамкі міжнароднага права і ўсіх маральных крытэрыяў.

Выкарыстанне Польшчай і Літвой сілы ў адносінах да мігрантаў накіравана на іх запалохванне. Такое меркаванне БелТА выказаў **эксперт РГА «Белая Русь» Пётр ПЯТРОЎСКІ.** «Тут хочацца падкрэсліць самае галоўнае — Польшча і Літва не выконваюць свае абавязацельстваў унутры Еўрапейскага саюза. І вось гэтыя акцыі, калі польскія і літоўскія сілавікі проста збіваюць, выкарыстоўваюць непрапарцыянальную сілу ў адносінах да мігрантаў, накіраваны на іх запалохванне. На тое, каб у свядомасці мігрантаў гэтыя дзве краіны асацыіраваліся з ксенафобіяй, расізмам не на ўзроўні нават нейкіх маргінальных грамадскіх або палітычных груп, а на ўзроўні дзяржаўнай палітыкі. І на гэта ўсё разлічана. Я думаю, што з боку Польшчы і Літвы будуць прадаўжацца такія дзеянні. Паколькі яны добра разумеюць, што сіл самастойна спыняць, закрыць вось гэтыя міграцыйныя патокі ў законных рамках у іх няма. І толькі псіхалагічны націск, толькі запалохванне, на іх думку, можа некім чынам на гэта паўплываць», — сказаў Пётр Пятроўскі.

Эксперт асабліва акцэнтаваў увагу на бяздзейнасці ў гэтай сітуацыі Брусэля і ЕС.

**ТЫМ ЧАСАМ**

Жыццю і здароўю дзяцей з Ірака, дастаўленых у бальніцу з беларуска-польскай граніцы, нішто не пагражае. Пра гэта БелТА паведамілі ў Гродзенскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы.

Адразу пры паступленні дзяцей абследавалі. Па выяўленых адхіленнях стану здароўя прызначана лячэнне. «Цяпер яны адчуваюць сябе значна лепш», — падкрэсліў ў клініцы. Працягвае работу з пацярпелымі псіхолаг.

Сітуацыя з дзецьмі на кантролі мясцовай улады. Іх наведалі намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Пранюк і старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Жук. Яны ўручылі дзецям прадуктовыя наборы, неабходныя рэчы, перададзеныя прадпрыемствамі і грамадскімі арганізацыямі рэгіёна. Раней гігіенічныя наборы і вопратку дзецям перадала Гродзенская абласная арганізацыя Беларускага Чырвонага Крыжа.

**Пётр ДУНЬКО.**

Надвор'е

# ХОЛАДНА І ДАЖДЖЛІВА

## У мінулыя выхадныя выпала каля паловы месячнай нормы ападкаў

**Учора цэнтр халоднага цыклону перамясціўся з тэрыторыі нашай краіны на Бранскую вобласць Расіі. Але шчыльныя дажджавыя аблокі па-ранейшаму будуць накрываць краіну верасноўскімі ападкамі. На працягу тыдня нас чакае халоднае і вільготнае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сіноптыкі адзначаюць, што за два дні выхадных ападкаў выпала больш чым дастаткова, а месцамі па Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях — нават больш за тое, што звычайна бывае за ўвесь верасень. У рэкардсменах — Ваўкавыскі раён. Тут за суботу і нядзелю выпала 78 мм ападкаў, што складае 126 % месячнай нормы.

А з аўторка паветраная маса на тэрыторыю нашай краіны працягне паступаць з поўначы Еўропы.

І ў сераду Беларусь застанецца пад уплывам халодных паветраных мас і атмасферных франтоў цыклону. Будзе пераважаць воблачнае надвор'е. На значнай частцы тэрыторыі пройдуць невялікія дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах могуць узнікаць туманы. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 7 градусаў. Удзень будзе 4—10 цяпла, па паўднёвым захадзе — 6—12 градусаў вышэй за нуль.

Не стане цяплей у нас і ў чацвер. У гэты дзень захаваецца ўплыў халодных і няўстойлівых паветраных мас, будзе воблачна з праясненнямі. Уначы ў многіх раёнах пройдуць невялікія дажджы, удзень дажджоў стане менш, і яны будуць насіць кароткачасовы характар. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман. Вецер прагназуецца няўстойлівы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—7 цяпла, а ўдзень будзе ад плюс 5 градусаў да 11 цяпла, па паўднёвым захадзе — плюс 12—14 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу надвор'е стане фарміраваць чарговая сістэма атмасферных франтоў з Балтыйскага мора. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Вецер прагназуецца паўднёвы з пераходам на заходні парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 9 градусаў, удзень — 7—14 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Дума становіцца пяціпартыйнай

**Дзярждума Расіі па выніках парламенцкіх выбараў, якія прайшлі 17—19 верасня, упершыню пасля доўгага перапынку становіцца пяціпартыйнай: да традыцыйна прадстаўленых у апошніх скліканнях фракцый «Адзіная Расія», КПРФ, ЛДПР і «Справядлівая Расія» дадаецца партыя правацэнтрысцкага толку «Новыя людзі», якая з'явілася ў 2020 годзе. Такія папярэднія вынікі галасавання апублікаваў ЦВК Расіі.**



Паводле папярэдніх даных, на выбарах па партыйных спісах перамагае «Адзіная Расія», якая атрымала 49,82 % галасоў. Значна палепшыла свой вынік у параўнанні з мінулымі выбарамі КПРФ, якая набірае 19,0 % галасоў. У ЛДПР — 7,49 %, у блока «Справядлівая Расія — За праўду» — 7,42 %. Партыя «Новыя людзі» набірае 5,35 %. Астатнія 9 партый, якія ўдзельнічалі ў выбарах, не змаглі пераадолець неабходны для траплення ў Дзяржадуму 5-працэнтны бар'ер.

Парламенцкія выбары ў Расіі праходзяць па змяшанай сістэме: 225 дэпутатаў абіраюцца па прапарцыянальнай сістэме (па партыйных спісах) і 225 — па аднамандатных акругах. Усяго ў Дзяржадуме 450 дэпутацкіх месцаў. Упершыню выбары адбыліся не ў адзін, а на працягу трох дзён. Акрамя таго, у якасці эксперымента на сёлетніх выбарах у сямі рэгіёнах было арганізавана электроннае галасаванне.

### Стральба ў Пермскім універсітэце: 8 загінулых

**Колькасць загінулых у выніку стральбы ў Пермскім дзяржаўным нацыянальным даследчым універсітэце вырасла да васьмі, паведамляе ТАСС са спасылкай на прэс-службу СК.**

«У выніку восем чалавек загінулі, яшчэ некалькі пацярпелі», — удакладнілі ў СК.

У Міністэрстве аховы здароўя РФ пацвердзілі гэтую інфармацыю, заўважыўшы, што медпамога аказваецца 24 пацярпелым. Па звестках ведамства, стральбу на тэрыторыі універсітэта адкрыў студэнт. Асоба падазронага ўстаноўлена. Ён быў паранены пры затрыманні ў сувязі з аказаным супраціўленнем і памёр у бальніцы.

Следчыя займаюцца зборам матэрыялаў аб падазроным, устанаўліваюць абставіны здарэння. На месцы злачынства працуюць следчыя-крыміналісты Галоўнага ўпраўлення крыміналістыкі СКР.

У Прыкам'і ў сувязі з трагедыяй у ВНУ 20 верасня адменены заняткі ва ўсіх школах, тэхнікумах і каледжах, паведамілі ва ўрадзе рэгіёна.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну ў сувязі з трагедыяй. Ад імя беларускага народа і сябе асабіста ён выказаў шчырыя спачуванні родным і блізкім загінулых, а таксама пажадаў хутчэйшага выздараўлення ўсім пацярпелым.**

# «ЗОЛАТА» СТАЎБЦОЎШЧЫНЫ

## Як мясцовыя ўлады вырашаюць кадравыя праблемы на сяле

**Апошнім часам Стаўбцоўскі раён дынамічна развіваецца па ўсіх кірунках: прамысловасці, сельскай гаспадарцы, сацыяльнай сферы. Будуюцца малочнатаварныя комплексы, жыллё, аб'екты сацыяльна-эканамічнага прызначэння, дзіцячыя садкі, школы. А значыць, больш камфортным становіцца жыццё людзей. Аб сацыяльна-эканамічным развіцці раёна, аб тым, што тут з'явіцца новага ў найбліжэйшай перспектыве, расказаў «Звяздзе» старшыня райвыканкама Дзяніс КОЛЕСЕНЬ.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Дзяніс Сяргеевіч, што ўяўляе сабой Стаўбцоўскі раён? Што тут пераважае: прамысловасць, сельская гаспадарка?***

— Наш раён сельскагаспадарчы, 18 прадпрыемстваў працуюць на зямлі, чатыры з іх прыватнай формы ўласнасці. Асноўны напрамак — прадукцыя жывёлагадоўлі: малако, мяса. На працягу апошніх сямі гадоў эканоміка рэгіёна дастаткова эфектыўная. У 2020-м дасягнулі надояў 6111 кілаграмаў малака на карову. Дынаміка 2021-га паказвае, што да канца года прырасцём яшчэ на 100 кілаграмаў. Гэта практычна сёмы вынік сярод 22 раёнаў Мінскай вобласці. Статак буйной рагатай жывёлы за гэты час павялічыўся на пяць тысяч галоў. Гэта стала магчымым дзякуючы рэалізацыі праграмы па захаванні буйной рагатай жывёлы. У нас раней былі пэўныя праблемы з кармавой базай, умовамі ўтрымання жывёл, кадрамі ў жывёлагадоўлі. Сёння сітуацыя выпраўляецца. Мы пабудавалі 27 прафілакторыяў, 17 клюшачнікаў, 104 сіласна-сянажныя траншэі, што дазволіла палепшыць якасць кармоў. Далей заняліся праблемай, звязанай з вытворчасцю малака. Яна заключалася ў тым, што ў раёне 75 % кароў знаходзяцца на прывязным утрыманні ў старых савецкіх памяшканнях. І толькі 25 % — сучасных комплексаў з даільнымі заламі. Таму пачалі рэалізоўваць праграму па будаўніцтве малочнатаварных комплексаў. За тры гады фактычна ўвялі шэсць, будуюцца яшчэ тры. Праграма будзе працягвацца, рыхтуем праекты на 2022 год. Вобласць бярэ на сябе фінансаванне жалезабетонных канструкцый, астатняе дабудоўваем за ўласныя абаротныя сродкі. Я лічу, што гэта сур'ёзны драйвер па нарошчванні вытворчасці малака і адыходзе ад старых тэхналогій.

У раслінаводстве прадстаўлены ўвесь комплекс сельскагаспадарчых культур. Традыцыйна займаемся зернем, цукровымі буракамі, бульбай, да нядаўняга часу вырошчвалі лён. Сёлета імкнёмся адысці ад гэтай культуры, паколькі Валожынскі льнозавод далекавата ад Стоўбцаў, што не дазваляла працаваць рэнтабельна. Найбольш прыбытковы рапс, аграрыі называюць яго «золатам», «нафтай», як хто. Пры добрым ураджаі на гэтую культуру закупачныя цэны дазваляюць вырашыць многія фінансавыя праблемы. Сёлета, зрэшты, як і ўся краіна, мы не дабралі зерневых з-за надвор'я. Мінус чатыры цэнтнеры з гектара ў параўнанні з мінулагоднім, лічу, — не катастрофа.

Словам, ёсць да чаго імкнуцца, але і саромецца няма чаго — працуем са станоўчай дынамікай.

***— Як пачуваюць сябе на Стаўбцоўшчыне прамысловыя прадпрыемствы?***

— У раёне ёсць прадпрыемствы розных форм уласнасці. Горадаўтваральнае — філіял Мінскага маторнага завода — 1000 работнікаў, Стаўбцоўскі мясакансервавы камбінат — 350. Па фінансавых паказчыках гэта адно з самых моцных прадпрыемстваў у раёне, з добрай рэпутацыяй на рынках Расійскай Федэрацыі. Ужо фактычна гатовыя дакументы для супрацоўніцтва з кітайскім партнёрам. Былі падрыхтаваны да адпраўкі першыя партыі прадукцыі, але з-за пандэміі каранавіруса працэс прыпынены. На выхадзе праект па будаўніцтве новага забойнага цэха з сертыфікатам халяль, што дазволіць выходзіць на рынак арабскіх краін.

Новасвержанскі лесазавод — эксպартаарыентаванае прадпрыемства, перажывала розныя этапы ў сваёй гісторыі. Быў час, калі звальняліся людзі. Але дзяржава падставіла плячо, завод мадэрнізавалі, сфарміравалі калектыў дасведчаных спецыялістаў. І цяпер прадпрыемства кожны год дадае ў аб'ёмах вытворчасці, выйшла на прыбытковую работу.

Стаўбцоўскі філіял Гарадзейскага цукровага камбіната перапрацоўвае дары саду і агарода. Знакаміты сваімі напаўняльнікамі для ёгуртаў. А бярозавы сок пастаўлялі нават у Злучаныя Штаты Амерыкі.

Завод па вытворчасці халадзільных вітрын «Фрэор Рэфрыгерайшн» — прадпрыемства прыватнае. Яго абсталяванне паступае практычна ва ўсе супермаркеты Мінска. Спектр прадукцыі пашыраецца.

Завод па перапрацоўцы бульбы «Сула Плюс» на першым этапе перапрацоўвае 75 тысяч тон клубняў. На выхадзе атрымліваецца своеасаблівы парашок, у які дадаецца кіпень, і маса пераўтвараецца ў бульбяное пюрэ, якое можна спажываць у ежу. Шырока прымяняецца ў харчовай прамысловасці. Дастаткова запатрабаваная прадукцыя ў краінах арабскай дугі, з імі ёсць пэўныя дамоўленасці і кантракты. Такіх заводаў на постсавецкай прасторы толькі два — у Беларусі і Расіі.

У раёне летась запусцілі кацельню на мясцовых відах паліва. Інвестыцыі ў яе склалі 12 мільёнаў рублёў, 50 працэнтаў з абласнога бюджэту і 50 — ад Міністэрства паліва і энергетыкі. Гэта дазволіла нам адысці ад спажывання цяпла філіяла Мінскага маторнага завода. З пачатку года мы сэканомілі 1,2 мільёна рублёў.

На Стаўбцоўшчыне зарэгістравана 1300 прадпрымальнікаў, прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу, якія адлічваюць у раённы бюджэт 25 працэнтаў ад усіх паступленняў. Для такога невялікага райцэнтра, як наш, гэта — нядрэнны вынік.

***— Наколькі памятаю, раней у райцэнтры быў дэфіцыт кадраў медыкаў, ды і ў самой установе аховы здароўя ўмовы для працы персаналу і лячэння пацыентаў былі не з лепшых. Сітуацыя памянялася?***

— Прычым кардынальна: у нас з'явілася амаль што новая раённая бальніца — пасля рэканструкцыі і рамонту. Пры наведванні ўстановы аховы здароўя кіраўнік дзяржавы даў даручэнне адкрыць на яе базе міжраённае траўматалагічнае аддзяленне. Гэта правільнае рашэнне. Мы знаходзімся на трасе М1. На жаль, часта здараюцца аварыі, і людзі ў цяжкім стане паступаюць у першую чаргу ў нашу бальніцу. Практычная работа па стварэнні і камплектацыі гэтага аддзялення вядзецца і хутка будзе завершана. Таксама плануем устанавіць, як паказаў час, вельмі запатрабаваны апарат камп'ютарнай тамаграфіі. Нашы людзі змогуць на месцы, без праблем прайсці абследаванне, не трэба будзе ехаць у Бараўляны.

З навінак у сацыяльнай сферы — новая школа на 720 месцаў у мікрараёне, які актыўна забудоўваецца. Пабудавалі за год.

***— Кожны чалавек імкнецца займець дах над галавой. Ці можаце вы забяспечыць усіх ахвотных асабістым кутком?***

— Штогод у раёне ўводзіцца ў эксплуатацыю 25 тысяч квадратных метраў жылля, у тым ліку 15 тысяч квадратаў індывідуальнага. Канешне, у першую чаргу будуем для шматдзетных сем'яў. Больш чым год у чарзе гэтая катэгорыя грамадзян не стаіць. Тут ёсць і адваротны бок медаля: адбываецца адток кадраў з сяла. Сёлета ў Стоўбцах колькасць вучняў павялічылася, а ў вёсках зменшылася на 150 чалавек. У выніку — вычэрпваем кадравы патэнцыял з сельскай мясцовасці.

Каб спыніць гэты працэс, дазволілі выкупляць жыллё службовага фонду, прапрацаваўшы 10 гадоў у сельгасарганізацыі. Для шматдзетных сем'яў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, зрабілі выключэнне: яны могуць выкупляць дом, не чакаючы гэтага тэрміну. Тым самым імкнёмся спыніць адток працаўнікоў з сяла, зацікавіць застацца ў сельскай мясцовасці. Хтосьці прымае такія ўмовы, а нехта спрабуе хітрыць. Не прывязтвае жыллё, каб яго набыць ва ўласнасць, а становіцца ў чаргу на кватэру ў райцэнтры.

Будуем жыллё і ў сельскай мясцовасці. Безумоўна, менш, чым раней, калі рэалізоўвалася адпаведная дзяржаўная праграма. Сёлета пачнём узвядзенне 8-кватэрнага дома ў прыгараднай гаспадарцы. Паколькі людзі адаптаваны пад гарадскі лад жыцця, то падчас апытання, якое мы праводзілі, яны выказалі жаданне жыць не ў індывідуальным, а ў шматкватэрным доме.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## «Разумны клас» па астраноміі і астрафізіцы адкрылі ў Гродне

**Цэнтр уяўляе сабой дапоўнены віртуальнай рэальнасцю кабінет з сучасным абсталяваннем, якое дазваляе вывесці назіранне за зоркамі і планетамі на больш якасны пазнавальны ўзровень.**


Фота grodnonews.by

Зона віртуальнай рэальнасці — адна з самых захапляльных у цэнтры. З дапамогай спецыяльнага абсталявання і праграмы навучэнцы маюць магчымасць цалкам акунуцца ў свет касмічнай прасторы, пабываць у сонечнай сістэме і нават паўзаемадзейнічаць з рознымі планетамі, пазнаючы новую інфармацыю.

Асаблівае месца ў класе займае смарт-галерэя. На першы погляд здаецца, што намаляваныя на сцяне галактыкі і планеты выконваюць інтэр'ерную функцыю. На самай справе гэта прастора для гульнефікацыі адукацыі.

У ліку яркага аснашчэння цэнтра — смарт-глобус, які таксама працуе праз дадатак на смартфоне, зрэшты, як і многае, што маецца ў кабінеце. Так, каб за лічаныя секунды даведацца ўсё пра космас, будову атмасферы, зямлі і іншых планет, дастаткова проста навесці камеру на глобус.

Акрамя таго, кабінет аснашчаны новым тэлескопам, сучаснымі падручнікамі па астраноміі і астрафізіцы і ўсім неабходным абсталяваннем для правядзення канферэнцый, круглых сталоў у рэжыме анлайн.

Характэрна, што кабінет будзе працаваць як гарадскі рэсурсны цэнтр, таму наведаць яго змогуць усе ахвотныя.

## Бібліякафэ чакае наведвальнікаў

**Супрацоўнікі Кіраўскай цэнтральнай бібліятэкі знаходзяць і папулярызуюць розныя формы работы з чытачамі. Адна з такіх — адкрыццё ва ўстанове бібліякафэ.**

Гэта своеасаблівая інтэрактыўная выстаўка кніг, афармленая ў выглядзе кафэ. Бібліятэкары распрацавалі найлепшае «меню» для яго наведвальнікаў: «Класічнае аліўе» — прадстаўлена літаратура рускіх класікаў; «Любоўны кактэйль» — творы прызнаных аўтараў жаночага рамана Т. Усцінавай, Т. Палякoвай, Т. Алюшынай і іншых; «Комплексны абед» — кнігі пра падарожжы і прыгоды, а таксама пра смачную і здаровую ежу.

Кожнаму наведвальніку бібліякафэ прапануецца выбраць самую «смачную кнігу» або «далікатэсны часопіс».

У якасці «чаявых» наведвальнікі пакідаюць пажаданні і водгукі.

Бібліятэкары ўпэўненыя, што восеньскія халодныя вечары лепш за ўсё праводзіць не толькі са слоічкам смачнага варэння і кубкам духмянай гарбаты, але і з цікавай кнігай!

Бібліякафэ чакае сваіх наведвальнікаў!

## «Злавілі» крымінальную справу: пад Асаўцамі рыбакі незаконна лавілі рыбу

**Супрацоўнікі абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслиннага свету затрымалі парушальнікаў на пойменным вадаёме ракі Сож — возеры Галава, непадалёк ад Асаўцоў і Бабовічаў.**



Двое рыбакоў улоў здабывалі трыма рыбалоўнымі сеткамі з выкарыстаннем маторна-вяслярнай лодкі, абсталяванай лодкавым маторам.

Злавіць атрымалася нямала: плотка, чырванапёрка, акунь рачны, лешч, жэрах, сом. Агульная вага здабычы — больш за 11 кілаграмаў. Шкода навакольнаму асяроддзю нанесена ў памеры 141 базавай велічыні, а гэта больш за 4 тысячы рублёў.

Гомельскім РАСК у дачыненні да рыбакоў узбуджана крымінальная справа.

## Пінск і Мінск звяжа новенькі дызель-цягнік PESA

**Ён пачне курсіраваць з 24 верасня.**


Фота vb.by

Новы састаў будзе хадзіць па звыклай нумарацыі № 859/860, але цяпер цягнік ДП6 будзе змяшчаць удвая больш пасажыраў і атрымае падвойную класнасць. З 311 месцаў для сядзення 25 будуць прадстаўляць сабой першы клас, астатнія — другі. Пры гэтым прасторны салон і крэслы з індывідуальным рэгуляваннем становішча спінкі крэсла і падлакотнікаў, інфармацыйная аўдыя- і відэасістэма, персанальныя разеткі для кожнага пасажыра і наяўнасць Wi-Fi ў вагонах павінны зрабіць паездкі са сталіцы Беларусі ў сталіцу Палесся і назад максімальна камфортнымі. Акрамя таго, у вагонах салона маецца шматфункцыянальная зона для перавозкі пасажыраў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, пасажыраў з дзіцячымі калыскамі, веласіпедамі і буйным багажом. У Пінскім райвыканкаме абяцаюць, што ў найбліжэйшай будучыні на лінію выйдуць яшчэ два аналагічныя саставы.

# НАСУПЕРАК ПАНДЭМІІ

## ГАТОВЫ ДА РАЗГОРТВАННЯ «ЧЫРВОНЫХ ЗОН»

Мінскі навукова-практычны цэнтр хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі аказваў дапамогу пацыентам з COVID-19, у прыватнасці, яго аддзяленні інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі, дзе назапашаны самы вялікі вопыт лячэння пацыентаў з лёгачнай паталогіяй. І цяпер тут прымаюць самых цяжкіх пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй з усёй краіны:

— Літаральна на днях забралі на лячэнне маладую маці пасля родаў у Пінску. Пакуль у нас задзейнічана тры ложкі. Калі пачнецца павелічэнне хворых, дапамогу будзе аказваць уся рэанімацыя, — кажа Алег Румо. — Аднак у хуткім часе плануецца адкрыццё новага корпуса, такім чынам, нашы лячэбна-дыягнастычныя магчымасці пашырацца. Таму ў мяне няма сумненняў, што мы будзем выконваць аперацыі пры звычайных хірургічных паталогіях, кардыёхірургічных захворваннях, трансплантацыі ў поўным аб'ёме, нягледзячы на каранавірусную інфекцыю.

РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава пакуль не прымала пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй. Але да гэтага медыкі гатовы.

**Папярэднія вынікі паказалі добрую пераноснасць вакцыны — амаль без дадатковых пабочных эфектаў, што вельмі важна для супрацьпухлінных сродкаў, якія звычайна вельмі таксічныя. Па шэрагу злаякасных новаўтварэнняў атрыманы адметны вынік.**



Дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталагіі і гематалогіі Алег РУМО.



Нейрахірург намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Эдуард ВАСІЛЕВІЧ.



Анколаг намеснік дырэктара па навуковай рабоце Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Сяргей КРАСНЫ.

Гэта цяпер горад называецца Слаўгарадам. Такое імя Прапойску падарылі ўжо пасля вайны. Горад знаходзіцца на ўзвышшы, дзясяткі тысяч чырвонаармейцаў склалі тут свае галовы падчас яго абароны і вызвалення. Летась на полі каля вёскі Папоўка, што за некалькі кіламетраў ад Слаўгарада, «паднялі» каля двух дзясяткаў байцоў. Ужо тады было вядома, што прыйдзецца вярнуцца. І вось сёлета на тым жа самым полі, дзе мясцовая гаспадарка вырошчвае хлеб, зноў знойдзены астанкі герояў.

— Мы ведаем дакладна, хто тут ваяваў, — 219-я мотастралковая дывізія, — кажа **кіраўнік групы «Дняпроўскі рубеж» Павел КОНЧЫКАЎ**. — Гэта ўсё байцы 710-га мотастралковага палка 25-га мехкорпуса. Усе, каго знайшлі летась, з гэтага палка. На разведку ідзе шмат часу. За дзень з пошукавай рамай на гэтым полі да 20 кіламетраў намотваю. Бачны сляды жорсткіх баёў і падбітай тэхнікі. Нашы атакавалі з падтрымкай танкаў.

Павел расказвае, што гэтым месцам пошукавікі зацікавіліся, калі ў мясцовым ляску сталі знаходзіць байцоў. А як толькі ў рукі трапілі нямецкія аэрафотаздымкі і стала вядома, дзе знаходзіліся пазіцыі, прыступілі да разведкі. «Спачатку мы вырашылі, што нашы змагаліся на вышыні каля Папоўкі, але памыліліся: там заселі немцы, — дзеліцца падрабязнасцямі пошукавік. — Чырвонаармейцы атакавалі іх на голай тэрыторыі. І баі былі вельмі жорсткія».

У пошукавым руху — суцэльныя добраахвотнікі: адны адпрошваюцца з работы, іншыя ідуць у адпачынак, каб «пакапаць», трэція прысвячаюць гэтаму свае выхадныя. А ўлічваючы, што дарога і ежа за свой кошт, некаторыя проста на ўсе дні раскопак застаюцца на месцы і жывуць у палатках. У ляску за вёскай Папоўка «віккраўцы» жылі ўсю вахту. У першы ж дзень «паднялі» пяцярых байцоў, потым яшчэ шасцярых. А яшчэ — семярых немцаў, астанкі якіх перадалі арганізацыі «Народны саюз Германіі па доглядзе воінскіх пахаванняў».

— Усе сем немцаў «згубленыя» ў 41-м годзе, што бывае рэдка, — каментуе Павел Кончыкаў. — У іх на пачатку вайны ўлік быў жалезны. Але гэтыя «згубіліся». І больш за ўсё крыўдна, што з сямі немцаў шасцярых можна ідэнтыфікаваць па жэтонах. А вось імёны нашых яшчэ паспрабуй знайдзі!

Пошукі — наогул работа ювелірная. Метр улева, метр управа — і, калі прыборам не «зачапіў» байца, ён так і застанецца ляжаць у зямлі. Пошукавікі ж не экстрасэнсы.

— Я наогул веру толькі ў карпатлівую працу, — канстатуе Павел. — Узяць, напрыклад, леташнюю вахту. Працьма народу была з металашукальнікамі. Але адзін баец так і застаўся ляжаць збоку. Паўметра да яго не дайшлі. Я яго толькі цяпер знайшоў. Абазначыў кропку і пайшоў з рамай далей. І зноў сігнал. Сталі капаць — чатыры чалавекі. Калі ўжо ўсе паехалі, я прайшоўся на ўсялякі выпадак яшчэ раз. І прыбор адрэагаваў на чарговую знаходку. Адлегласць была ўсяго шэсць метраў.

А ў аўторак на полі за Папоўкай знайшлі камісара. У яго падсумку ляжалі нарукаўныя зоркі. Перад тым як ісці ў атаку, ён іх зрэзаў, каб не стаць лёгкай здабычай снайпера. Вядома ж, што камісараў і камандзіраў яны забівалі ў першую чаргу. «У атаку ішлі ўсе, нягледзячы на званні, — кажа Павел. — А тут, хутчэй за ўсё, атакавалі з апошніх сіл...»

## ДАТУ ДАПАМОГ УСТАНАВІЦЬ... НЕМЕЦ

Жорсткія баі паміж 219-й мотастралковай дывізіяй генерала Корзуна і 95-м пяхотным палком 17-й пяхотнай дывізіі немцаў на полі каля вёскі Папоўка разгарнуліся пасля 20 ліпеня 1941 года.

— Немцы занялі Прапойск 15 ліпеня, і нашы атрымалі загад любымі сродкамі, не лічачыся са стратамі, выбіць іх з горада, перакрыць стратэгічную Варшаўскую шашу і не пусціць гітлераўцаў на ўсход — Крычаў, Рослаўль, Смаленск, Маскву, — расказвае кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалай Барысенка. — У загадзе таксама гаварылася, што пасля таго, як будзе ўзяты Прапойск, трэба развярнуць наступленне на Магілёў, каб дэблакіраваць акружаны горад.

Бывалы пошукавік прызнаецца, што гэта было для яго адкрыццём. Раней не ведалі, што вызваленне Магілёва ўваходзіла ў задачы 25-га мехкорпуса. Але цяпер адкрываюцца ўсё новыя дакументы — і нашы, і нямецкія.

Для байцоў 710-га палка бой за Прапойск быў вельмі трагічны. У іх атрымалася ўварвацца ў горад, але немцы іх выбілі, і яны замацаваліся тут, пад Папоўкай. Немцы заселі з кулямётамі каля «варшаўкі», а чырвонаармейцы штурмавалі іх на адкрытай мясцовасці. Гэта зараз тут лес, а раней было чыстае поле. У асноўным савецкія байцы гінулі за 100—150 метраў ад дарогі. Менавіта тут іх цяпер і знаходзяць пошукавікі. Дарэчы, у адным акопе ляжалі тры чырвонаармейцы і на невялікай адлегласці — немец. Як высветлілася, гэта быў снайпер. Ужо вядома, што ён загінуў 24 ліпеня 1941-га. Па гэтай даце атрымалася ўстанавіць і дзень гібелі нашых салдат, якія ляжалі побач з ім.

## ЯНЫ НАС АБАРАНЯЛІ, А МЫ ІХ ПРОЗВІШЧАЎ НЕ ВЕДАЕМ

У апошняй экспедыцыі гэтага палявога сезона прымала ўдзел больш чым 50 чалавек, у тым ліку настаўнікі, музейныя работнікі. **Сяргей ЖЫЖЫЯН**, які **ўзначальвае пошукавую групу «Быхаўскі рубеж»**, яшчэ і **дырэктар Быхаўскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея**. Ён заснавальнік пошукавай групы і не натхняльнік. За дзесяць гадоў яе дзейнасці пошукавы рух у раёне стаў аўтарытэтным і ўплывовым. Пошукавікаў заўважылі, ім дапамагаюць.

— Група стваралася пры музеі не столькі з мэтай папаўнення яго фондаў, колькі для развіцця пошукавай работы ў раёне, — кажа кіраўнік. — У музей сталі звяртацца па дапамогу адшукаць зніклых без вестак, з мэтай даведацца пра месцы пахавання родных, наяўнасці іх імён на абеліскох. На жаль, вельмі шмат у нас воінскіх пасляваенных пахаванняў, якія не фіксаваліся належным чынам.

За 10 гадоў дзейнасці «Быхаўскі рубеж» вярнуў з небыцця больш за дзясятак імёнаў. А летась упершыню за ўвесь час існавання быхаўскія пошукавікі знайшлі байца з медалямі — «За адвагу» і «Баявыя заслугі». У будучыні яны папоўніць фонды музея. Знамянальна, што адзін з медалёў баец атрымаў за баі на Быхаўшчыне. І загінуў на тэрыторыі раёна — на Лудчыцкіх вышынях. Сяргея Жыжыяна як музейшчыка цікавіць яшчэ і бытавы бок вайны. Назбіралася шмат асабістых рэчаў чырвонаармейцаў, якія шмат чаго расказваюць пра сваіх гаспадароў.

— Калі глядзіш на лыжку, дзе выбіта імя салдата, успрымаеш яе нават па-іншаму, — кажа ён. — У нас розныя ёсць. Напрыклад, лыжка, дзе замест ручкі — гільза. Або лыжка, прастрэленая куляй. Асабістыя рэчы — гэта, вядома, не медальён, але і яны дапамагаюць у пошуках без вестак загінулых. Знайшлі адночы байца з медалямі, а з ім у магіле быў другі баец з біклагай, на якой надрапаны літары «КІФ». Па спісах беззваротных страт выйшлі на ўладальніка медалёў і прачыталі, што з ім загінуў Іван Фёдаравіч Крылоў. І літары на біклазе адразу ж набылі сэнс. Крылоў быў туляком, мы потым яго сваякоў знайшлі.

Суразмоўнік прызнаецца, што ўсё часцей задумваецца пра адкрыццё асобнага музейнага куточка, дзе будуць захоўвацца вось такія бытавыя рэчы. Яны вельмі добра дапамагаюць спасцігнуць увесь трагізм той вайны.

— На музейных занятках мы даносім да дзяцей вельмі сумную статыстыку, — канстатуе Сяргей Жыжыян. — За 10 гадоў наша група знайшла больш за 200 салдат, а імёны ўстанавілі толькі ў дзесяцярых. Гэта не радуе. Людзі нас абаранялі, а мы нават іх прозвішчаў не ведаем.

У музеі штогод ладзяцца краязнаўчыя чытанні, па выніках якіх выдаецца зборнік матэрыялаў. Іх ужо дзевяць. І практычна ў кожным ёсць даклад кагосьці з пошукавікаў. Для будучых пакаленняў там вельмі добрыя напрацоўкі.

— Магчыма, праз час з'явяцца новыя методыкі, прыборы, тэхналогіі. І гэта дасць новы штуршок для пошукавых даследаванняў, — спадзяецца дырэктар музея.

## ГЭТА ТРЭБА НЕ МЁРТВЫМ...

У экспедыцыі «Сожскі рубеж» удзельнічалі не толькі зацікаўленыя, але і моладзь. Пошукавік, дэпутат Магілёўскага гарсавета, завуч магілёўскай сярэдняй школы № 34 Галіна Бяляева прывезла з сабой добраахвотнікаў з Магілёва — гімназіі № 1 і школ №№ 1, 2, 8, 34. Удзельнічала таксама моладзь абласнога цэнтра творчасці, Магілёўскага электратэхнічнага каледжа, Васькавіцкай сярэдняй школы, слаўгарадскіх школ №№ 1 і 2, а таксама Слаўгарадскага прафліцэя.

— Гэта сапраўды тыя, каму цікава ваенная археалогія, — адзначае **начальнік штаба клуба «Віккру», метадыст абласнога цэнтра творчасці Святлана БАРЫСЕНКА**. — Вучань магілёўскай гімназіі № 1 Дзіма Хмяльніцкі нават медальён знайшоў. А адзін з удзельнікаў у свой дзень нараджэння паехаў з намі ў Шклоўскі раён у экспедыцыю. Запомнілася таксама, што, калі мы ўзнагароджвалі школьнікаў, адзін з іх так расхваляваўся, што нават не мог ісці. Прызнаўся, што ногі сталі ватнымі.

Застаецца дадаць, што пошукавы палявы сезон – 2021 у Магілёўскай вобласці скончаны. Пошукі былі арганізаваныя абласным гісторыка-патрыятычным пошукавым клубам «Віккру» пры садзейнічанні Магілёўскага аблвыканкама, абласнога цэнтра творчасці, 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, райвыканкамаў, а таксама пракуратуры Шклоўскага раёна. Вядзецца работа па ўстанаўленні новых фактаў, звязаных з генацыдам мірнага насельніцтва. Пакуль пошукавікі праводзяць разведку. Што датычыцца апошняй экспедыцыі, то, як адзначыў **прадстаўнік 52-га пошукавага батальёна прапаршчык Дзмітрый КАРАЛЁЎ**, яна была плённая:

— Толькі падчас работы ў Чавускім і Слаўгарадскім раёнах атрымалася «падняць» 25 байцоў і шэсць медальёнаў, — заўважыў ён. — Па медалі «За баявыя заслугі» ўстанавілі імя загінулага, і ўжо знойдзены яго родныя. Наогул, галоўнае ў пошукавай рабоце — знайсці родных. Да нас вельмі шмат інфармацыйных лістоў прыходзіць і з іншых раёнаў і абласцей. І кожнае месца мы павінны ў канкрэтныя тэрміны адпрацаваць. Работы вельмі шмат.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота Святланы БАРЫСЕНКІ.**

*Слаўгарадскі раён.*




Лічылі кулі ваш дэсантны ўзвод,
Шалела рэха танкавых матораў,
Падбітай птушкай падаў верталёт,
І заступалі шлях чужыя горы...

Мінае дзень за днём, за годам год,
А памяць успамінаў не сцірае -
Вядзе мяне да помніка таго,
Дзе маладое дрэўца падрастае.

Сябры мае, я з вамі назаўжды,
І нават там, дзе ў бездань дзень знікае,
Я распазнаю вашы галасы
І ў адным страі зноў павітаю.

*(Фотаздымкі зроблены ў Капылі, дзе каля мемарыяла ў памяць воінаў-інтэрнацыяналістаў устаноўлена гранітная пліта з імёнамі землякоў.)*



Дажынкі-2021

# ЗОЛАТА ПА ІМЕНІ ХЛЕБ



**У мінулыя выхадныя ў райцэнтры Шуміліна Віцебскай вобласці правялі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2021».**

Святочны настрой і адчуванне таго, што будзе цікава, арганізатары абласнога свята стварылі ўжо пры ўездзе ў гарадскі пасёлак, дзе жыве каля 7,5 тысячы чалавек.

У прыватнасці, каля будынка чыгуначнага вакзала можна было перанесціся ў часе і ўбачыць Шуміліна далёкага мінулага. Дарэчы, сёлета спаўняецца 155 гадоў з таго часу, як паміж найстарэйшым горадам сучаснай Беларусі і абласным цэнтрам пачаліся чыгуначныя зносіны. 17 кастрычніка 1866 года кіраўнік будаўніцтва, першы міністр шляхоў зносін генерал-лейтэнант П. П. Мельнікаў далажыў цару ў тэлеграме «...у 9 гадзін 30 хвілін адкрыты рух на ўчастку Полацк — Віцебск працягласцю 242 вярсты...». Бюст Мельнікаву можна ўбачыць каля будынка вакзала. Чыгуначная станцыя ў Шуміліне — адна з найстарэйшых у Беларусі. Яе пабудавалі ў 1866 годзе, заснавальнікамі выступілі прамыслоўцы з Лондана і Рыгі. У другой палове мінулага стагоддзя станцыя была пераназваная з Сіроціна ў Шуміліна...



На сотні метраў расцягнуліся гандлёвыя рады. Асабліва прыемна было завітаць у госці да прадстаўнікоў раёнаў, якія ў ліку іншага знаёмілі з кулінарнымі традыцыямі роднага краю. Такое ў крамах не прадаецца, таму многім хацелася паспытаць на смак тое,





што гатавалі продкі ўдзельнікаў «Дажынак». Традыцыйна з вялікім інтарэсам людзі падыходзілі да месцаў, дзе гандлявалі рамеснікі. Народ ахвотна фатаграфаваўся каля жывых скульптур, а таксама каля робата, якім кіравалі дыстанцыйна. Спадабаліся многім праект «Дажыначны сноп», свята ручніка «Шлях жыцця»... Цікавай была выстаўка сельскагаспадарчай тэхнікі мінулага і сучаснасці. Многія з задавальненнем рабілі сэлфі, падняўшыся на вышыню больш чым у два паверхі, каб убачыць, што знаходзіцца ўнутры кабіны камбайна.

**Старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Мікалай ШАРСНЁЎ** павіншаваў гасцей і ўдзельнікаў свята падчас ганаровай цырымоніі. «Вырасціць і сабраць ураджай — складаная задача, рашэнне якой па сілах толькі згуртаванаму, прафесійнаму калектыву, сапраўдным гаспадарнікам, майстрам з вопытам і новымі ведамі, працавітым людзям з цярплівым характарам.

Нягледзячы на вельмі складанае па ўмовах надвор'я жніво, аграрыямі Віцебшчыны вырашчаны і сабраны дастойны ўраджай — больш за 780 тысяч тон збожжа, сярэдняя ўраджайнасць — 25,6 цэнтнера з гектара», — сказаў кіраўнік аблвыканкама.

Палова атрымана ўраджаю сфарміравана Аршанскім раёнам, які пераадолеў стотысячны рубеж па намалоце, а таксама Віцебскім, Талачынскім, Дубровенскім і Верхнядзвінскім раёнамі.

Губернатар агучыў словы шчырай падзякі ўсім героям жніва, тым, хто сваімі рукамі, майстэрствам і самаадданай працай здабывае беларускае золата, імя якому — хлеб.

Вядома, што «Дажынкі» — важны сацыяльна-культурны праект, які выхоўвае любоў і павагу да зямлі і працы, спрыяе навядзенню парадку, добраўпарадкаванню нашых населеных пунктаў.

За час падрыхтоўкі да свята гарадскі пасёлак Шуміліна таксама вельмі змяніўся, літаральна зазззяў новымі фарбамі. Ад улады Прыдзвінскага краю Мікалай Шарснёў выказаў удзячнасць будаўнікам і работнікам камунальнай службы за зладжаную і дзейсную працу.

Амаль на ста аб'ектах вяліся работы. Сярод іншага абнавілі Алею славы. СШ № 1 імя П. Акуцыёнка цяпер у спісе школ будучыні, а ў СШ № 2 — стала больш утульна. На стадыёне правялі рэканструкцыю, і там адбыліся дажыначныя спаборніцтвы — спартакіяда вобласці па сілавым мнагаборстве. Другое жыццё атрымаў цэнтр культуры. Многае зроблена, каб стварыць умовы, якія адпавядаюць патрэбам часу, у дзіцячых садках, бібліятэцы, гісторыка-краязнаўчым музеі, паліклініцы, дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе алімпійскага рэзерву...

Мясцовыя жыхары ацанілі і праведзены ў шматпавярховых дамах капітальны і бягучы рамонт. Многія заўважылі, што дарогі і тратуары ў Шуміліне цяпер не горшыя, чым у цэнтры Віцебска.

У наступным годзе «Дажынкі» пройдуць у Глыбокім.

***Аляксандр ПУКШАНСКІ,***
**фота аўтара.**

Мы там былі

# ПАД ПАРАСОНАМІ, АЛЕ З НАСТРОЕМ

## У Гродне на Дні горада ўшанавалі найлепшых гродзенцаў, адкрылі фестываль сыру і паслухалі святочны канцэрт

**Штогод у трэцюю суботу верасня гродзенцы святкуюць Дзень горада. А сёлета гэтай падзеі папярэднічала і новае дзяржаўнае свята. Можна сказаць, што Дзень горада завяршыў цэлы шэраг урачыстых мерапрыемстваў, якія прайшлі напярэдадні і былі прысвечаны Дню народнага адзінства. Дарэчы, і дэвіз гарадскога свята быў адпаведны: Гродна3D#адзінства. Для святкавання 893-й гадавіны Гродна была запланавана працяглая праграма.**

Праўда, з-за няспыннага дажджу некаторыя лакацыі не ўдалося праверсці ў поўным маштабе. І хоць прыходзілася ўвесь час не выпускаць з рук парасоны, усе, хто прыйшоў апоўдзень на плошчу Леніна, сталі сведкамі ўрачыстага відовішча. Менавіта тут, на галоўнай сцэне, адбылося адкрыццё гарадскога свята з удзелам абласных і гарадскіх улад, прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса, грамадскасці горада. У прывітальным лісце старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Караніка яшчэ раз згадалі тэму Дня народнага адзінства і важнасці гэтай даты для гродзенцаў. Па сутнасці, 17 верасня стала адпраўным пунктам для развіцця Заходняй Беларусі ў складзе адзінай краіны. А сёння сучасныя пакаленні працягваюць ствараць дабрабыт краіны, аддаючы сваю працу, талент, стараннасць дзеля росквіту сваёй Радзімы, гаварылася ў пасланні губернатара.

Найлепшыя гродзенцы ўдастоены ганаровага звання «Чалавек года Гродна». Такое званне існуе на ўзроўні вобласці, і вось упершыню яно зацверджана і для жыхароў горада. Узнагароду за асаблівыя заслугі атрымалі 12 чалавек — прадстаўнікі розных сфер дзейнасці: ад прамысловай да сацыяльнай.



Яшчэ чацвёра гродзенцаў дапоўнілі Кнігу Славы горада. А трое жыхароў абласнога цэнтра ўдастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Гродна». У іх ліку — заснавальнік будаўніча-мэблевай кампаніі «ЗОВ» Уладзімір Зухавіцкі, рэктар Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта Вітольд Песціс, кіраўнік галаўнога філіяла ААТ «Прыёрбанк» па Гродзенскай вобласці Міхаіл Шылін.

**Старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў ГОЙ** выказаў словы падзякі ганаровым гараджанам, а таксама ўсім гродзенцам, хто любіць і цэніць гэты старажытны, але такі малады і сучасны горад.

— Сёння Гродна — гэта абласны цэнтр, які дынамічна развіваецца. Нягледзячы на ўсе складанасці мінулага года, мы змаглі рэалізаваць новыя інфраструктурныя праекты, — зазначыў падчас сваёй прамовы мэр горада. — Завяршылася будаўніцтва новага аўтамабільнага моста — самага высокага ў Беларусі. Асаблівая ўвага сёлета ўдзялялася вырашэнню камунальных праблем.

Мэр горада прывёў такія лічбы. Адрамантавана 75 тысяч метраў дарожнага палатна, у горадзе з'явіліся першыя электробусы, за гэты год мяркуецца ўвесці ў эксплуатацыю больш за 200 тысяч квадратных метраў жылля, што дазволіць вырашыць жыллёвую праблему сотням гродзенскіх сем'яў. Развіваюцца новыя мікраараёны — Альшанка і Грандзічы. Там будуюцца дзіцячы сад, школа і паліклініка.

А падчас свята, бадай, самым папулярным стаў фестываль сыру. Ён праходзіць у Дзень горада



ўжо восьмы раз і заўсёды выклікае інтарэс у наведвальнікаў як дэгустацыяй розных відаў сыру, так і магчымасцю набыць сваю любімую марку. Увогуле, шырокі асартымент быў прадстаўлены амаль усімі вытворцамі гэтай прадукцыі. А найбольш масава выглядалі арганізатары фестывалю — ААТ «Малочны Мір». Было зазначана, што сыраробчы кірунак — адзін з прыярытэтных у нашай краіне. Толькі ў Гродзенскай вобласці штогод перапрацоўваецца 1,3 млн тон малака, выпускаецца 50 тыс. тон сыру. Валютная выручка ад рэалізацыі сырнай прадукцыі склала ў рэгіёне больш за 150 млн рублёў. Такія лічбы прывёў падчас адкрыцця фестывалю сыру першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Валяваты.

Нягледзячы на тое што некаторыя лакацыі з-за дажджу прыйшлося адмяніць, канцэрт пад адкрытым небам усё ж такі адбыўся. На плошчы Леніна стварылі святочны настрой вакальныя і танцавальныя калектывы горада. На іншых пляцоўках выступілі кавер-бэнды і прайшоў фестываль касплею «Кампай». Гэта касцюміраваная папулярная ў свеце гульня, якая дазваляе кожнаму на нейкі момант стаць акцёрам, раскрыцца па-новаму. Вечарам на плошчы Леніна прайшоў канцэрт з удзелам беларускіх артыстаў. А вось заяўлены ў праграме вядомы спявак Кай Метаў не змог выступіць з-за аварыі, у якую трапіў па дарозе ў Гродна. Праўда, артыст паабяцаў, што абавязкова пазней прыедзе сюды з сольным канцэртам. Свята завяршылася позна вечарам лазерным шоу і феерверкам.

***Маргарыта УШКЕВІЧ,***
**фота grodnonews.by**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества СЗАО «ЛадаГарант»

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона с учетом НДС 20 %, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кап. строение с инв. № 500/U-67339, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – подземный гараж-стоянка на 94 машино-места | 2 229 880,54 | 222 988,05 | 111 494,03 |

Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 500000000005006899 площадью 1,0724 га. Право общей долевой аренды (24/625 доли) с 30.07.2014 по 30.11.2052

В отношении Лота проводятся первые торги

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **22 октября 2021 года в 13.00 (регистрация с 12.30 до 13.00)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 |
| **Прием заявлений** | Начало приема заявлений в 10.00 21.09.2021 г. Окончание приема заявлений в 16.00 21.10.2021 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Местонахождение имущества** | Республика Беларусь, г. Минск, ул. Железнодорожная, 44/1 |

**Условия для участия в торгах**

1. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте **https://orgtorg.by/info/.**
2. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту 1, принадлежащему СЗАО «ЛадаГарант», проводимых 22.10.2021. **Срок внесения задатка: с 21.09.2021 в 10.00 по 21.10.2021 в 16.00.**
3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).
4. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. Вознаграждение аукциониста составляет 1,75 % от конечной цены предмета торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.
5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов и наличию обременений обращаться к Дмитрию (+375172197569).
7. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
8. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **СЗАО «ЛадаГарант», 220014, г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 16) (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293953088 (Илья)** |

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: право заключения договора аренды сроком 3 года капитального строения, инв. № 110/С-72339 (назначение – здание специализированное железнодорожного транспорта), площадью 332,9 кв. м с покрытием площадью 351 кв. м, расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Фроленкова, 7А.

Условия проведения аукциона: целевое назначение арендуемых площадей – оказание услуг, организация розничной торговли, размещение офиса (сотрудников), организация общественного питания.
Размер ежемесячной арендной платы: 213,06 базовой арендной величины.
Начальная цена продажи объекта – 3 600,71 руб. (три тысячи шестьсот рублей семьдесят одна копейка) с учетом НДС.
Сумма задатка – 360 руб. (триста шестьдесят рублей)

Продавец – УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичский вагонный участок, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, УНП 200272821, тел./ф. (0163) 60-60-62, тел. 73 43 42

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-70

Условия расчетов и заключения договора аренды:
- срок подписания договора аренды – 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды;
- срок оплаты – 3 рабочих дня с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды)

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB3012050083 3225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 22 октября 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 20 октября 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion/**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70. Тел. +375 29 6139869** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Производственно-складское помещение** | 893,9 кв. м | 500/D-798186687 | **г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12-2** |
| **Складское помещение** | 1127,4 кв. м | 500/D-798186686 | **г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12-1** |

***В состав лота входит оборудование***: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1 003 336,00 дол. США**
Шаг аукциона – 50 166,80 дол. США

**Лот № 2**

| | |
|---|---|
| **Ограждение бетонное** (инв. номер 980773) | **г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12** |

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 6 120,00 дол. США**
Шаг аукциона – 306,00 дол. США

***Сведения о земельном участке по лотам № 1 и № 2:*** пл. **0,8393 га,** предоставлен продавцу на праве общего долевого постоян. пользования (доля: 9/20) для обслуживания здания специализир. складов, торг. баз, баз матер.-технич. снабжения, хранилищ. ***Ограничения (обременения) прав:*** охранные зоны линий связи и радиофикации (пл. 0,0883 га), электрич. сетей (пл. 0,1015 га), сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4060 га) и канализации (пл. 0,0580 га)

**Лот № 3**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Административное, производственное** | 2007,2 кв. м | 500/С-21619 | **г. Минск, пр-т Пушкина, 70** |

***В состав лота входит оборудование***: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 1 287 211,20 дол. США**
**Шаг аукциона – 64 360,56 дол. США**

**Лот № 4**

| | |
|---|---|
| **Домик-сторожка** (инв. № 2) | **г. Минск, пр-т Пушкина, 70** |
| **Ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4) | |
| **Ворота самонесущие с электромехан. приводом и калиткой** (инв. № 5) | |
| **Теплотрасса** (инв. номер 30121 | |

**Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 6 012 дол. США**
Шаг аукциона – 300,60 дол. США

***Сведения о земельном участке по лотам № 3 и № 4:*** пл. **0,3600 га,** предоставлен продавцу на праве постоян. пользования. Целевое назначение: реконструкция здания кассет. цеха с размещением администрат. помещений и механосбороч. производства. ***Ограничения (обременения) прав:*** охранные зоны технич. водопровода (пл. 0,0883 га), газофикации сред. давления (пл. 0,0414 га)

**Лоты № № 5–21 – оборудование и транспортное средство, бывшие в употреблении**
Месторасположения: г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70

| Лот № | Наименование | Инв. № | Начальная цена* (с НДС 20 %), дол. США | Шаг аукциона, дол. США |
|---|---|---|---|---|
| 5 | Аппарат гидроабразивной резки | 70103 | 68 160,00 | 3 408,00 |
| 6 | Аппарат плазмен. резки CUT120 IGBT | 70074 | 528,00 | 26,40 |
| 7 | Вертикальный обрабат. центр с ЧПУ ECO CENTER 350 CNC с системой управления GPPlus 450 | 70089 | 25 200,00 | 1 260,00 |
| 8 | Обрабат. центр(Si) Vector1500 CNC*CNC | 41031 | 58 920,00 | 2 946,00 |
| 9 | Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124 | 70124 | 66 960,00 | 3 348,00 |
| 10 | Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4 | 41028 | 43 680,00 | 2 184,00 |
| 11 | Станок радиально-сверлильный 2К522 | 41022 | 3 960,00 | 198,00 |
| 12 | Станок специ. ленточно-отрез. МП6-1570 | 41007 | 1 920,00 | 96,00 |
| 13 | Техн. линия по производ. путев. шуруп. на базе стана попереч.-клин. с инд. нагрев. SPL2500-2-IH-133 | 70179 | 928 800,00 | 46 440,00 |
| 14 | Токар. станок с индикатором положения Turnado 280/1500 | 41033 | 5 400,00 | 270,00 |
| 15 | Токарный станок с ЧПУ Fanuc Oi-Mate с накладной станиной Compact 330 | 41034 | 32 640,00 | 1 632,00 |
| 16 | Широкоунивер. фрезерный станок с УЦИ ZX 635ОС | 41025 | 5 644,00 | 282,20 |
| 17 | Автомобиль MAZ 437 143 329-00 (рег. знак АР 0818-7) | - | 11 640,00 | 582,00 |
| 18 | Станок Hedelius-CB 80 Magnum | 70147 | 91 200,00 | 4 560,00 |
| 20 | Станок консольно-фрезерный ВМ127М | 41019 | 9 786,80 | 489,34 |
| 21 | Станок отрезной ДОС | 41012 | 324,00 | 16,20 |

• Цена снижена по лоту № 20 на 14 % и по лоту № 21 на 32 %

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона** проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона)

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни по предварительному согласованию +375 (29) 6139869, Дмитрий

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридич. лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения аукциона.
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации или явки на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок заключения договора купли-продажи – 10 (десять) дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 (трех) процентов от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 17.08.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона по лотам №№ 19–21** | **04.10.2021 г. в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, время начала и окончания приема заявлений по лотам №№ 19–21** | **с 09.00 21.09.2021 г. до 17.00 01.10.2021 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ОАО «СКБЗ «Альбертин», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Фабричная, д.1** |

**Предмет аукциона**

**Здание молодежного центра** (здание нежилое), общ. пл. **909,3 кв. м**, инв. № **450/С-158**, адрес: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Колхозная, д. 8.

Составные части и принадлежности (согласно техническому паспорту): теневой навес, забор (2 шт.), ворота (2 шт.), калитка.
**Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество,** установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной.
**Земельный участок** пл. 0,3894 га предоставлен на праве постоянного пользования

**Начальная цена: 160 320,00 бел. руб. (с НДС 20 %)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** от цены продажи предмета электронных торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» 21.07.2021

**Дата и время начала и окончания торгов: 21.10.2021 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 19.10.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

Эксклюзіў

# У чым сакрэт «кода поспеху» Камуністычнай партыі Кітая?

## Распавёў «Звяздзе» Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се Сяаюн

— Апошнім часам для многіх замежных сяброў «код поспеху» Камуністычнай партыі Кітая (КПК), які прыносіць не толькі карысць кітайскаму народу, але і натхняе ўвесь свет ужо на працягу цэлага стагоддзя, больш ужо не тая загадка, якая раней ніяк не знаходзіла свайго адказу, — заўважыў Се Сяаюн. — Такія складнікі гэтага «кода поспеху», як ідэйная канцэпцыя развіцця, якая ставіць народ у цэнтры ўвагі, накіраванасць на тое, каб крочыць у нагу з часам, палітычная смеласць самарэвалюцыі і адаптаваная да мясцовых умоў стратэгія адраснай барацьбы з беднасцю, дапамагаюць людзям лепш зразумець пытанне: якой менавіта палітычнай партыяй з'яўляецца КПК?

26 жніўня Аддзелам прапаганды ЦК КПК апублікаваны дакумент пад назвай «КПК: гістарычная місія і ўклад». Дакумент усебакова распавядае пра стагадовую барацьбу КПК, дае глыбокае тлумачэнне яе ідэй, практыкі і дасягненняў у кіраванні краінай, падрабязна аналізуе, адкуль і куды рушыць кампартыя. Для сусветнай супольнасці дакумент цалкам можа стаць карысным кіраўніцтвам, каб зразумець КПК аб'ёмна, усебакова і па сутнасці.

### Сэрца для народа

— Па-першае, КПК — гэта палітычная партыя, якая ўсім сэрцам служыць народу. Дакумент у такіх раздзелах, як «Вярхоўнае месца ў сэрцы — гэта народ», «Народ — апора беспераных перамог», «Народ — гаспадар краіны», «Народ павінен мець найлепшае жыццё», ярка тлумачыць каштоўнасную арыентацыю КПК, глыбока раскрывае логіку свайго развіцця і код перамогі за мінулае стагоддзе. Ярка дэманструецца цвёрдая пазіцыя КПК як марксісцкай партыі і глыбокае суперажыванне з народам як вялікай партыі са стагадовым мінулым.

З дня свайго заснавання КПК прымае імкненне народа да шчасця і адраджэнне кітайскай нацыі як сваю асноўную мэту і першапачатковую місію, — падкрэсліў Се Сяаюн. — І кампартыя прывяла народ да гэтай мэты шляхам працяглай барацьбы. Сёння кітайцы жывуць так, як марылі тысячагоддзямі. Кітайская нацыя, здзейсніўшы вялікі скачок і стаўшы на ногі, стала багацейшай і мацнейшай, паспяхова ажыццявіла «мэту першага стагоддзя» — усебаковую пабудову сярэднезаможнага грамадства і цяпер з поўнай энергіяй рухаецца да ажыццяўлення «мэты другога стагоддзя» — усебакова будаваць мадэрнізаваную сацыялістычную дзяржаву.

### Бліскучыя перспектывы

— Па-другое, КПК — гэта палітычная партыя, якая не стамілася ад рэалізацыі сваіх ідэалаў. Дакумент у такіх раздзелах, як «Прытрымлівацца навуковых тэорый як кіраўніцтва», «Цвёрда быць прыхільнымі ідэалам і перакананням», «Беспярэпынна прасоўваць свае пошукі» і «Устойліва пераадолець усялякія рызыкі і выклікі», апісвае, як КПК пад кіраўніцтвам марксізму з цвёрдай верай, адвагай у пошуках, духоўнай непахіснасцю і нягнуткай упартасцю вяла нястомную барацьбу за шчасце народа і адраджэнне кітайскай нацыі, — адзначыў Се Сяаюн.

На працягу ста гадоў КПК заўсёды прытрымліваецца ідэалаў і перакананняў камунізму і сацыялізму, заклікае людзей цвёрда рушыць наперад да мэты барацьбы, развіваецца і ўма-



цоўваецца ў вельмі цяжкіх сітуацыях, дамагаецца прарываў з бязвыхаднага становішча, рашуча пераадольвае цяжкасці і нягоды. КПК, высока трымаючы вялікі сцяг сацыялізму з кітайскай спецыфікай, дэманструе жыццяздольнасць і бліскучыя перспектывы.

### Надзейная апора

— Па-трэцяе, КПК — гэта палітычная партыя з моцным лідарствам і кіраваннем. Дакумент у такіх раздзелах, як «ЦК КПК моцны і магутны», «Распрацаваць правільныя палітычныя курсы, стратэгіі і тактыкі», «Эфектыўна рэалізаваць вызначаныя рашэнні і планы», «Аб'яднаць разнастайныя сілы» і «Загартаваць высокакваліфікаваныя кадравыя атрады», сістэмна раскрывае ключ да таго, чаму КПК здольная на поспехі.

Кітай як краіна з велізарнай тэрыторыяй, вялікім насельніцтвам і найскладанейшымі нацыянальнымі ўмовамі павінна мець моцнае кіраўніцтва, каб паспяхова імкнуцца да незалежнасці, развіцця і росквіту, — лічыць Се Сяаюн. — Гісторыя і практыка неаднаразова даказвалі, што КПК з'явілася самай надзейнай апорай кітайскага народа і самай надзейнай кіруючай сілай у момант узрушэнняў і цяжкасцяў менавіта дзякуючы свайму моцнаму лідарству і мастацтву кіравання.



### Смеласць да самарэвалюцыі

— Па-чацвёртае, КПК — гэта палітычная партыя, якая заўсёды захоўвае бадзёрасць і жыццяздольнасць. Дакумент, зыходзячы з чатырох аспектаў, такіх як «Прыхільнасць прынцыпам унутрыпартыйнай дэмакратыі», «Смеласць выпраўляць памылкі», «Падтрыманне здароўя арганізма» і «Акцэнт на навучанні і падвядзенні вынікаў», раскрывае таямніцу КПК у захаванні яе бадзёрасці і жыццяздольнасці.

Смеласць да самарэвалюцыі — гэта самая адметная рыса КПК, а таксама яе самая вялікая перавага, — упэўнены Се Сяаюн. — За мінулае стагоддзе КПК, пераадолеўшы ўзрушэнні і вытрымаўшы любыя выпрабаванні, зноў і зноў знаходзіцца ў авангардзе эпохі і захоўвае энергію маладосці, менавіта дзякуючы таму, што яна можа не толькі весці народ для ажыццяўлення вялікай сацыяльнай рэвалюцыі, але і здзяйсняць вялікую самарэвалюцыю і заўсёды падтрымліваць сваю жыццяздольнасць.

### Агульныя каштоўнасці

— Па-пятае, КПК — гэта палітычная партыя, якая ўносіць уклад у мір і развіццё чалавецтва. Згодна з дакументам, «Падтрымліваць мір ва ўсім свеце», «Садзейнічаць агульнаму развіццю», «Прытрымлівацца шляху мірнага развіцця» і «Прасоўваць пабудову супольнасці адзінага лёсу чалавецтва» з'яўляюцца каштоўнасцямі і практычнымі дзеяннямі кампартыі.

КПК, для якой будучыня і лёс чалавецтва — заўсёдны яе клопат, гатоваяісці наперад рука аб руку з усімі прагрэсіўнымі сіламі свету, — кажа Се Сяаюн. — Пры любых міжнародных абставінах КПК заўсёды адстойвае такія агульныя каштоўнасці ўсяго чалавецтва, як мір, развіццё, роўнасць, справядлівасць, дэмакратыя і свабода. Яна заўсёды прасоўвае дух інтэрнацыяналізму, заўсёды стаіць на правым баку гісторыі і на баку прагрэсу чалавецтва, робіць унёсак у справу міру і развіцця нашага свету.

### Як прадбачыць будучыню?

Варта адзначыць, што, як гаворыцца ў заключэнні дакумента, «Палітычныя партыі, як і развіццё ўсіх падзей, маюць бачную логіку. Зыходзячы з мінулага КПК, мы можам растлумачыць яе сучаснасць і прадбачыць яе будучыню». Азіраючыся на мінулае, стагадовая барацьба і дасягненні кіравання КПК прынеслі мудрасць усходняга народа на карысць развіцця і прагрэсу сусветнай палітычнай цывілізацыі і ўнеслі важны ўклад у забеспячэнне ўстойлівага і мірнага развіцця чалавецтва. Звярнуўшы позірк у будучыню, Кітай пад кіраўніцтвам КПК будзе працягваць адыгрываць ролю адказнай дзяржавы і надаваць новы імпульс сумеснаму развіццю ўсіх краін свету шляхам свайго новага развіцця.

Пасля таго, як у 2016 годзе выйшла ў свет рускамоўнае выданне кнігі «Сі Цзіньпін. Аб дзяржаўным кіраванні», цікавасць да вывучэння ідэйнай канцэпцыі і практыкі дзяржаўнага кіравання Кітая ўсё больш расце ў Беларусі, і ўзаемнае ўзбагачэнне паміж нашымі краінамі ў галіне дзяржаўнага кіравання працягвае паглыбляцца, — мяркуе Се Сяаюн. — Я ўпэўнены, што дакумент «КПК: гістарычная місія і ўклад», безумоўна, выкліча цікавасць у многіх беларускіх сяброў, якія імкнуцца яшчэ лепш зразумець феномен КПК.

*Падрыхтаваў*
***Мікалай ЛІТВІНАЎ.***


**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»**
**ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **СП «АМИПАК» – ОАО** (УНП 400054120), 247355, Гомельская обл., г. Буда-Кошелево, ул. Ленина, д. 61, тел. +375 (33) 652-24-94, в лице антикризисного управляющего Жуковой Валентины Ивановны.

Вторые повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **06 октября 2021 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 321/С-1577, площадью 782,9 кв. м (одноэтажное бетонное здание консервного склада), Гомельская обл., г. Буда-Кошелево, ул. Головачёва, 38/2 | 66 330,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 321/С-363, площадью 828,8 кв. м (одноэтажное кирпичное здание овощехранилища), Гомельская обл., г. Буда-Кошелево, ул. Головачёва, 38/1 | 65 700,00 |
| 3 | Ограждение, инв. № 0-433, Гомельская обл., г. Буда-Кошелево, ул. Головачева, 38 | 19 710,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 321/С-11963, площадью 1442 кв. м (одноэтажное бетонное здание коровника на 200 голов), Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, 1/4 | 6 960,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. № 321/С-11960, площадью 1432,4 кв. м (одноэтажное кирпичное здание коровника на 250 голов) Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, 1/3 | 7 680,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. № 321/С-11959, площадью 1328,2 кв. м (одноэтажное кирпичное здание коровника), Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, 1/2 | 5 040,00 |
| 7 | Капитальное строение с инв. № 321/С-11962, площадью 1087 кв. м (одноэтажное кирпичное здание коровника на 200 голов), Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, 1/5 | 640,01 |
| 8 | Капитальное строение с инв. № 321/С-11961, площадью 291 кв. м (одноэтажное кирпичное здание магазина), Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, Губичский с/с, 1 | 13 200,00 |
| 9 | Вертикальный сверлильный станок 2С163Б, инв. № 0-9105 | 1 600,00 |
| 10 | Оборудование термоформовочное СТА-150М, инв. № 0-792 | 12 330,00 |
| 11 | Оборудование термоформовочное СТА-150М, инв. № 0-793 | 12 330,00 |
| 12 | Оборудование термоформовочное СТА-150М, инв. № 0-794 | 12 330,00 |
| 13 | Станок односторонний рейсмусный, инв. № 0-3702 | 1 530,00 |
| 14 | Станок вертикально-сверлильный, инв. № 0-3709 | 990,00 |
| 15 | Станок внутришлифовальный 3К227А, инв. № 0-328 | 2 700,00 |
| 16 | Станок зубодолбежный, инв. № 0-323 | 4 770,00 |
| 17 | Универсальный фрезерный станок, инв. № 0-10003 | 1 400,00 |
| 18 | Таль ручная ТРШСп-3,2Н-15м, инв. № 0-233 | 510,00 |
| 19 | Таль ручная ТРШСп-3,2Н-15м, инв. № 0-234 | 510,00 |
| 20 | Таль ручная ТРШСп-3,2Н-15м, инв. № 0-235 | 510,00 |
| 21 | Таль ручная ТРШСп-3,2Н-15м, инв. № 0-236 | 510,00 |
| 22 | Агломератор СЕ 99, инв. № 0-426 | 4 700,00 |
| 23 | Гранулятор KUHNE K70 E-33, инв. № 0-258 | 36 600,00 |
| 24 | Экстудер BARMAG KL 103, инв. № 0-3 | 97 200,00 |
| 25 | Бобинорезательная машина FSL-K1300A, инв. № 0-928 | 19 800,00 |
| 26 | Бобинорезательный станок FSL 1300, инв. № 0-9035 | 19 800,00 |
| 27 | Машина печатная двухцветной тампонной печати, инв. № 0-656 | 4 320,00 |
| 28 | Стол для заседаний (И351/Интеллекта/кшт/акмол), инв. № 0-273 | 990,00 |
| 29 | Коэкструзионная линия для выдува 3-слойной пленки ALPINE, инв. № 0-899 | 217 800,00 |
| 30 | Мясорубка МИМ-350, инв. № 0-447 | 540,00 |
| 31 | Вакуумная установка УВ-77-А, инв. № 0-906 | 37 440,00 |
| 32 | Вакуумная установка УВ-77-А, инв. № 0-909 | 37 440,00 |
| 33 | Вакуумная установка УВ-77-А, инв. № 0-642 | 26 370,00 |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 21.09.2021 г. 09.00 по 05.10.2021 г. 17.00:

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY;

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB3012 1854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 календарных дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 12.06.2021 г.



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи» (Продавец)**

**Лот № 1:** когенерационная установка JMC 620GS-N.L производства австрийской фирмы «JenBacher», состоящей из двух модулей, 2009 г. в.

Адрес: Минский р-н, г.п. Мачулищи, ул. Солнечная, 6.

Начальная цена с НДС – 7 851 600,00 руб. Задаток – 392 580,00 руб. Шаг аукциона – 5 %. Штраф – 100 000,00 руб.

Аукцион состоится **22.10.2021 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.** Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127 80290010000000 ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – **20.10.2021 г. в 11.00**.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Царква Святой Тройцы, вёска Вялікая Сваротва, *Баранавіцкі раён.*

# ТРОХКУТНІК ВЕРЫ

**Зайздрошчу цяперашнім школьнікам. Пра славутасці малой радзімы ім цяпер на ўроках расказваюць, яны разам з настаўнікамі ладзяць экспедыцыі, вывучаюць ваколіцы на прадмет цікавінак, памятных месцаў, розных гістарычных адзнак. У нас было інакш. Каб на ўроку гісторыі ды расказаць пра закінуты культавы будынак — пра што вы гаворыце?! На дварэ стаяў ваяўнічы атэізм, а школьнікам кожную вясну нагадвалі аб недапушчальнасці паходаў да капліцы ў Велікодную ноч. Бацькі часам згадвалі пра ранейшыя прыгожыя цэрквы, ды і то мімаходзь, храмы спалілі ў вайну, калі яны былі яшчэ дзецьмі.**



## Двор з валасцю

У 1943 годзе на тэрыторыі цяперашняга Пачапаўскага сельсавета былі знішчаны дзве прыгожыя царквы з бутавага каменю: адна — у вёсцы Пачапава, другая — за чатыры кіламетры — у вёсцы Вялікая Сваротва. Пра апошнюю, незвычайную царкву ў імя Святой Тройцы, у якой некалі хрысцілі маіх бацькоў, зараз гаворка. Яна сапраўды выглядае непрывычна, бо не зусім звычайнай формы, зробленая з трох сцен. У аснове пабудовы — класічны роўнастаронні трохвугольнік. Спецыялістамі адзначана, што ў Беларусі другой такой царквы няма.

Звесткі пра яе можна знайсці ў розных гістарычных даведніках. Багатую гісторыю мае не толькі храм, але і маёнтак Сваротва, ад якога засталіся толькі рэшткі вялікай дубовай алеі. «Двор Сваротва з валасцю Сваротаўскай» пазначаны ў метрыках ВКЛ яшчэ з 1498 года. У розны час Сваротвай валодалі магнаты Юдзіцкія, Тызенгаўзы. На пачатку XIX стагоддзя гаспадарамі Сваротвы становяцца Незабытоўскія. Апошняй гаспадыняй «Двара» мясцовыя жыхары называюць пані Грудзінскую. Яе яшчэ мая бабуля згадвала. Магчыма, гэта прозвішча ў замужжы адной з дачок кагосьці з Незабытоўскіх. Дык вось тая пані засталася ў памяці месцічаў як руплівіца дабрачыннасці: не забывала бедных, хворых, дапамагала вясковай школе. Пры жыцці маёй бабулі Сваротву аднавяскоўцы называлі Дваром і не інакш: «Пайшла ў Двор, прыйшоў з Двара».



У сярэдзіне XX стагоддзя Сваротваўскі маёнтак напаткала такая ж доля, як і многія суседнія. Яго разбурылі, разнеслі па цагліне, па каменьчыку. Калі б не малюнкі Напалеона Орды, ніхто б і не даведаўся, як выглядаў той маёнтак. На карціне відаць: сядзібны дом, узведзены Якубам Незабытоўскім, узвышаўся над астатняй ваколіцай. Як і ў большасці маёнткаў таго часу, побач былі афіцына і гасцявы дом, аранжарэя, з гаспадарчых пабудоў — лядоўня, кузня, сталярня, гумно. Акварэль Орды перадае матэрыяльнае ўвасабленне хоць і не раскошы пабудоў, але нейкую асаблівую элегантнасць архітэктуры.

Нават цяжка паверыць, што такой некалі была Сваротва. Сёння ў гэтай вёсцы не засталося нічога з аб'ектаў сацкультбыту, а большасць насельніцтва складаюць пенсіянеры.

## Ад драўлянага да каменнага

У першай чвэрці XVIII стагоддзя ўладальнікам Сваротвы быў Мікалай Аўсяны, грамадска-палітычны дзеяч ВКЛ. Вось ён і пабудаваў у 1747 годзе храм у імя Святой Тройцы, унікальны па сваёй архітэктуры. Храм меў форму правільнага трохвугольніка. Пабудову вянчалі чатыры купалы з крыжамі: большы — у цэнтры і тры меншыя — па кутах.

А ў 1823 годзе ўжо новыя гаспадары Незабытоўскія на месцы старой драўлянай царквы пабудавалі новую каменную, якая поўнасцю паўтарыла архітэктурнае аблічча папярэдняй. Храм меў па тры акны і адны дзверы ў кожнай сцяне. Вуглы атынкаваныя і арыгінальна дэкарыраваныя адзіночнымі ўстаўнымі калонамі. Вакол храма пабудавана невысокая агароджа, таксама з бутавага каменю і валуноў. Дакладна вядома, што спачатку храм быў уніяцкі, а пасля далучэння ўніятаў да праваслаўя стаў праваслаўны.

Чаму ў Сваротве пабудавалі менавіта такі, нехарактэрны для нашых мясцін, храм, застаецца загадкай. Апошнім часам мне давялося чытаць розныя версіі, навуковыя і калянавуковыя разважанні. Усе яны маюць права на існаванне і будуць, несумненна, цікавыя турыстам, што захочуць наведаць славутасць.

## Версіі і здагадкі

«Трохвугольныя кампазіцыі прыцягвалі буйных майстроў і тэарэтыкаў архітэктуры сваёй эксперыментальнай дзіўнасцю, магчымасцю развіваць і ўскладняць прывычныя матывы, што і было самамэтай для архітэктараў эпохі барока», — піша расійскі даследчык Аляксей Якаўлеў. Такія храмы з'явіліся спачатку ў Францыі, Італіі, Германіі, а затым і ва Усходняй Еўропе. Магчыма, гаспадары маёнтка захацелі мець спрошчаную копію нейкага заходнееўрапейскага храма і заказалі яе архітэктару.

Яшчэ адна версія: напачатку храм узводзілі як масонскае збудаванне. Тады і да нашых магнатаў даходзіла еўрапейская мода на ўсялякія нефармальныя суполкі. Адна з галін такога аб'яднання гуманістычнай накіраванасці — камандорыя мальтыйскіх рыцараў — знайшла сваіх прыхільнікаў на тэрыторыі сучаснага Баранавіцкага раёна. А чым масоны горшыя? Але ўсё гэта, вядома, здагадкі, і не больш.

Мне асабіста найбольш сімпатычная экуменістычная версія. Экуменізм — рэлігійны рух, які выступае за аб'яднанне ўсіх хрысціянскіх канфесій. І вось уваходы з трох бакоў храма ўказвалі на тое, што католікі, праваслаўныя і уніяты заходзілі ў царкву праз розныя дзверы, а маліцца маглі каля аднаго алтара. Можа, хто з былых гаспадароў Сваротвы падзяляў погляды экуменістаў.

А вось айцец Георгій Сапун, які адрадзіў зруйнаваны храм, меў сваю, крыху празаічную, версію. Ён лічыў, што пры будаўніцтве магло не хапіць грошай на чацвёртую сцяну, і тэрмінова памянялі архітэктурны план, альбо месца на царкву не хапіла на нейкай абмежаванай прасторы. Магло быць і такое...

## Падзвіжнік Георгій Сапун

І яго, Георгія Савіча, у кантэксце гаворкі пра царкву варта згадваць нароўні з фундатарамі і будаўнікамі — Аўсяным і Незабытоўскім. Бо каб не сельскі святар Георгій Сапун, не было б гэтай царквы даўно, ніхто не спрачаўся б пра версіі яе ўзнікнення, не згадвалі б турысты Вялікую Сваротву.

Яго, Георгія Сапуна, біяграфія цягне на цэлую кнігу альбо кінасцэнарый. Далёка не ўсе прыхаджане, асабліва з маладзейшых, ведалі, які няпросты і пакручасты жыццёвы шлях у іх бацюшкі, колькі выпала на яго долю. Нарадзіўся Георгій у 1924 годзе ў вёсцы пад Валожынам у сям'і сельскага святара. Скончыў Навагрудскую настаўніцкую семінарыю. У вайну дапамагаў партызанам. А калі ў 1944-м яго прызвалі на фронт, сына прыйшоў праводзіць бацька-святар. Апошняе і стала ракавым для юнака. Яго, як сына служыцеля культу, не адправілі ў армію, арыштавалі і саслалі ў лагер у Сібір. Дрэвы ў тайзе пілаваў, у шахце працаваў. У 1947 годзе рашыўся ўцячы. Паводле яго слоў, дапамог другі ссыльны, добры чалавек. Яго дачка дастала ваенную форму, і 23-гадовы хлопец рушыў у бок Беларусі, дабіраўся да радзімы ў асноўным на дахах цягнікоў. У 1954 годзе паступіў у Мінскую духоўную семінарыю. Некаторы час служыў у Слонімскім раёне, а пасля быў накіраваны ў Пачапава. Служыў у невялічкай капліцы на мясцовых могілках і амаль паўвека збіраў грошы і выношваў планы адраджэння царквы ў сваім прыходзе.



## Лепей быць, чым не быць

Як ужо гаварылася, у 1943-м абедзве царквы спалілі. За 60 гадоў сцены-руіны зараслі дрэвамі, кустоўем і пакрысе разбураліся. Айцец Георгій да той пары адрадзіў Пачапаўскі храм і ў 2006 годзе, маючы ўзрост амаль 80 гадоў, узяўся за гэты — у Вялікай Сваротве. Мне шмат разоў даводзілася сустракацца і гутарыць з гэтым вясковым падзвіжнікам, сельскім інтэлігентам. Многія яго, мякка кажучы, не падтрымлівалі: «Навошта новы храм, калі менш чым за пяць кіламетраў ёсць дзейны, і той паўпусты?» Але ён не зважаў, толькі зрэдку нагадваў, што ўнікальнаму помніку дойліства, архітэктуры і духоўнасці лепей быць, чым не быць.

Пачынаў нястомны бацюшка сваю вялікую работу з фотаздымкаў. Заказаў некалькі соцень здымкаў храма, разаслаў па Беларусі і ў замежжа. Напісалі ў адной газеце, затым — у другой. І знайшоўся мецэнат. Да работы прыступілі, але не ўсё ішло гладка. На нейкі час работы прыпынялі з-за недахопу сродкаў. Але святар маліўся, прасіў, мясцовыя жыхары дапамагалі, чым маглі. Грошы збіралі, і будоўля зноў аднаўлялася. А ён штодня быў тут, дапамагаў сам, матушка Ганна гатавала ежу будаўнікам, ён прыносіў. Прасіў мясцовых мужчын папрацаваць, адным словам, быў душой гэтай будоўлі. Як ён гаварыў, з Божай дапамогай усё ж справу давёў да канца. І 19 ліпеня 2009 года архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Сцяфан асвяціў храм. Царкву аднавілі цалкам у ранейшым выглядзе, нават браму такую ж, як ранейшая, узвялі.

На гадавіну асвячэння храма сабралася столькі людзей, што яны з цяжкасцю памясціліся ў яго сценах, аўтар гэтых радкоў была таму сведкай. Прыехалі дзеці, унукі мясцовых жыхароў, далёкія сваякі, што не былі ў родных мясцінах амаль паўстагоддзя. Прыехалі, вядома, і фундатары, і рупліўцы храма. Гэта свята адначасова стала святам вёскі.

Расказвалі тады, што з'яўляецца нямала ахвотных павянчацца тут альбо пахрысціць дзіця. Да адных з месцічаў сваякі прыязджалі з Чэхіі. З інтэрнэту даведаліся, што на іх гістарычнай радзіме з'явіўся незвычайны храм, і сваё дзіця вырашылі ахрысціць менавіта тут.

Першым святаром тут быў выпускнік Мінскай духоўнай семінарыі Антоній Маргун, які прыехаў са сваёй юнай матушкай Ліліяй. Потым працаваў другі святар, айцец Віталь. Сам жа Георгій Сапун у гэтай царкве не правёў ніводнай службы, казаў, што на будаўніцтве яго місія скончылася. А ў 2015 годзе протаіерэй Георгій Сапун адышоў у лепшы свет. Справа ж яго рук і нястомнай душы жыве.

* * *

У фундаментальным творы Анатоля Федарука «Старадаўнія сядзібы Берасцейшчыны» 2004 года выдання сваротаўскай царкве прысвечана некалькі сказаў. Аўтар з болем гаворыць, што гэты рэдкі помнік знаходзіцца ў поўным заняпадзе і патрабуе тэрміновай кансервацыі. Энцыклапедычны даведнік Кулагіна «Праваслаўныя храмы на Беларусі» (2001) размясціў інфармацыю пра гэтую царкву ў раздзеле «Страчаная спадчына». Хто б мог падумаць тады, што спадчына не будзе страчана, што руінам царквы не спатрэбіцца кансервацыя, што Свята-Троіцкі храм адродзяць у першапачатковым выглядзе!

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

# СТАЛІЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ:

## як выглядае Мінск на старадаўніх картах і планах

**У верасні прадпрыемства «Белкартаграфія» выпусціла ўнікальнае крыніцазнаўчае выданне «Мінск на старадаўніх картах і планах». Альбом змяшчае 140 каляровых старонак, дзе прадстаўлены 84 карты і планы, важныя гравюры, малюнкі, а таксама шэраг дакументаў, апублікаваных упершыню.**



У Сярэдзнія вякі на беларускіх землях узнікаюць першыя гарады, якія паступова становяцца цэнтрамі эканамічнага і культурнага развіцця краю. Гараджане штодзённай працай стваралі ўнікальную гарадскую прастору, якая, у сваю чаргу, сама ўплывала на іх жыццё. І картаграфічныя крыніцы ўтрымліваюць вельмі каштоўную інфармацыю для вывучэння гэтай прасторы і яе жыхароў. Насельніцтва Беларусі здаўна падтрымлівала разнастайныя сувязі з блізкімі і далёкімі краінамі. Такія кантакты, асабліва гандлёвыя, у значнай ступені ўплывалі на фарміраванне геаграфічных уяўленняў аб нашых землях у еўрапейскай і арабскай культуры Сярэднявечча і Новага часу. Узнавіць гэты вобраз дапамагаюць менавіта карты. Урэшце Мінск ужо ў XVI ст. быў адным з самых развітых беларускіх гарадоў. У другой палове XIX ст. пачынаецца яго хуткі эканамічны ўздым, а ў першай палове XX ст. ён становіцца адным з палітычных цэнтраў, а затым і сталіцай Беларусі. У сувязі з гэтым выданне набывае дадатковую актуальнасць у кантэксце вывучэння працэсаў станаўлення сучаснай беларускай дзяржаўнасці.




Але з чаго пачалося стварэнне альбома? Што ён з сябе ўяўляе? Якая практычная значнасць выдання? Больш падрабязна пра гэта расказжа **рэдактар альбома «Мінск на старадаўніх картах і планах» Аляксандра ШЫБАЕВА.**

***— Як прыйшла ідэя стварэння выдання і з чаго ўсё пачалося?***

— Пачалося ўсё са стварэння **«Вялікага гістарычнага атласа Беларусі».** Менавіта ў ім адзін з раздзелаў быў прысвечаны старажытным картам, на якіх пазначаліся беларускія землі ў розныя гістарычныя перыяды. Потым узнікла ідэя развіваць гэтую справу і ствараць альбомы старадаўніх карт на асобныя рэгіёны і гарады Беларусі. Вядома, што кожны горад мае сваю гісторыю картаграфавання. І першым, якраз да тысячагоддзя Брэста, быў створаны альбом **«Брэст на старадаўніх картах і планах»**, у якім сабрана больш за 45 старадаўніх карт, якія ахопліваюць гісторыю картаграфавання тэрыторыі ўсяго ўсходнееўрапейскага рэгіёна, у тым ліку беларускіх земель ад 1154 года да пачатку XIX стагоддзя. Спецыяльны змест альбома распрацавалі Ілья і Валянціна Андрэевы. Акрамя гэтага альбома, быў створаны атлас **«Брэст і наваколле ад старажытнасці да сучаснасці»**. Гэта выданне змяшчае храналогію фарміравання тэрыторый, збор старадаўніх картаграфічных матэрыялаў і сучасныя карты і планы. З дапамогай прадстаўленай інфармацыі можна прасачыць гісторыю фарміравання Брэсцкага раёна. Велізарная колькасць размешчаных у атласе карт дазваляе ўбачыць, як адлюстроўвалася гэтая тэрыторыя ў мінулым, у якія дзяржаўныя ўтварэнні ўваходзіла. Прадстаўлены фрагменты старадаўніх карт з вывай Брэста і наваколля. Можна ўбачыць фрагменты адной з найлепшых карт першай паловы XIX ст., створаная ў 1840 г. пад кіраўніцтвам генерала Ф. Шуберта. Берасцейшчына прадстаўлена на каляровым фрагменце гэтага твора. Спецыяльны змест распрацаваў Леў Раманавіч Казлоў.



Калі мы стварылі гэтыя два выданні, тады ж узнікла ідэя **«Мінска на старадаўніх картах і планах»**. Мы якраз паспелі выдаць альбом да свята горада. Вядома, вынашваюцца і іншыя ідэі стварэння старадаўніх карт на асобныя рэгіёны і гарады Беларусі.

***— Раскажыце, калі ласка, аб структуры выдання, яго змесце. Што наогул з сябе ўяўляе альбом?***

— Альбом «Мінск на старадаўніх картах і планах» працягвае серыю выданняў па гарадах і рэгіёнах Беларусі. Падрыхтаваны на беларускай мове. Картаграфічны матэрыял размеркаваны па храналагічным прынцыпе: ад Сярэднявечча да Другой сусветнай вайны. Першыя раздзелы выдання яскрава паказваюць уяўленні аб геаграфічным становішчы Усходняй Еўропы, у тым ліку беларускіх земляў, якія адлюстроўваліся на сярэднявечных картах, часта створаных на аснове складзеных яшчэ ў II стагоддзі нашай эры карт Клаўдзія Пталамея. Складальнікі альбома здолелі выказаць абнаўленне картаграфічных ведаў, што адбылося ў Еўропе ў XV—XVI стст., станаўленне ўласнай картаграфіі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Асаблівая ўвага звернута на размяшчэнне тапоніма «Белая Русь» на тагачасных картах. З сярэдзіны XVI стагоддзя на геаграфічных картах, створаных спачатку ў Заходняй Еўропе, а пасля і ў самім Вялікім Княстве Літоўскім, пачынае паказвацца ўласна Мінск.

Апошнія сем раздзелаў альбома дазваляюць выразна прасачыць развіццё Мінска на працягу двух стагоддзяў (1750—1940 гг.). У ім публікуецца вядомы план Мінска і першая вядомая гравюра горада, усе вядомыя гісторыкам планы XVIII ст., а таксама пазнейшыя. Пры гэтым якасць гарадскіх планаў пастаянна павялічвалася дзякуючы пераходу ў XIX стагоддзі да дакладных інструментальных вымярэнняў. Першыя ж планы горада і яго ваколіц захаваліся да нашых дзён толькі з другой паловы XVIII стагоддзя, але вядома, што існавалі і больш раннія планы — з пачатку XVII стагоддзя. У альбоме можна знайсці ўсе значныя планы горада Мінска (некаторыя адшукалі падчас работы над альбомам, яны не былі да гэтага вядомы шырокаму колу аматараў гісторыі Мінска). Усяго надрукавана каля трыццаці планаў Мінска і ваколіц.

***— У чым заключаецца практычная, гістарычная, навуковая значнасць выдання?***

— Безумоўным плюсам выдання з'яўляецца тое, што выявы карт і планаў суправаджаюцца не толькі кароткімі каментарыямі, але і пашыраным навуковым тэкстам. Гэта дае магчымасць чытачу зразумець працэс развіцця картаграфіі ў кантэксце гісторыі Беларусі і ўсёй Усходняй Еўропы. Сам тэкст заснаваны на фундаментальным вывучэнні крыніц і адзначаецца дакладнасцю. Суадносіны візуальнага і тэкставага матэрыялу збалансаваны. Выданне можа быць карысным як для вывучэння і выкладання беларускай гісторыі, так і для папулярызацыі айчыннага мінулага ў Беларусі і за яе межамі.



***— У чым заключаецца актуальнасць выдання?***

— Графічныя крыніцы па гісторыі архітэктуры і гарадской забудове Мінска XVIII стагоддзя даюць магчымасць уявіць горад у той час, калі ён займаў завяршаны рэнесансава-барочны партрэт. У XIX — пачатку XX стагоддзя прасочваюцца агульныя і для нашых гарадоў, і для Расійскай імперыі працэсы па наданні рэгулярнасці, большай практычнасці гарадской інфраструктуры.

Другая сусветная вайна прынесла непапраўныя страты і вялікія разбурэнні. Перабудова горада, якая пачалася ў пасляваенны час і працягваецца ў нашы дні, фактычна перапыніла і горадабудаўнічую, і сацыяльную пераемнасць са старажытным месцам.

Сёння з некалькіх соцень будынкаў XVII—XVIII стагоддзяў да нас дайшло не больш за два дзясяткі, некаторыя з іх значна перабудаваны або выключаны з жывой, абумоўленай унутранымі законамі развіцця, сацыяльна-тапаграфічнай структуры. Тым не менш, апублікаваныя планы і карты ваколіц горада могуць быць выкарыстаны як аснова для рэканструкцыі і рэтраспектыўнага вывучэння гарадской тапаграфіі і сацыяльнай прасторавай структуры. Таксама выданне паспрыяла аднаўленню або музеефікацыі ацалелай культурнай спадчыны горада.

***— Хто рупіўся над складаннем выдання?***

— Акрамя Ілы і Валянціны Андрэевых і Паўла Растоўцава, да працы былі далучаны спецыялісты з дзяржаўных архіваў і музеяў, шырокае кола гісторыкаў і мінскіх краязнаўцаў; на запыт адгукнуліся і прыватныя калекцыянеры, якія далі шмат матэрыялаў; некаторыя малюнкі былі з цяжкасцю атрыманы з замежных сховішчаў. І ўсё гэта для таго, каб падаць як мага больш разнастайны і поўны матэрыял, каб даў чытачу магчымасць убачыць насычаную фактуру беларускай гісторыі, багатую на падзеі.

Выдавецтва таксама шмат удзяліла ўвагі сучаснаму выгляду альбома: усе выявы былі апрацаваны і падрыхтаваны для якаснага друку.

Чытачу, і асабліва жыхару сталіцы, будзе цікава даведацца пра асаблівасці жыцця горада ў мінулыя стагоддзі, аб ужо легендарных месцах, якія захаваліся ў сучасных назвах раёнаў, вуліц або метро.

**Даніл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

---

Навінкі кнігарні

# Пазнаць традыцыі, характар і памкненні беларусаў

## дапаможа выданне, якое толькі што выйшла ў свет

**«Традыцыйная культура і побыт беларусаў» у серыі «Вялікая энцыклапедыя маленькага прафесара» выйшла ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».**

Ці ведаеце вы, што ў беларускай мове ёсць словы, якія ўтрымліваюць важную інфармацыю аб жыцці народа і часта не маюць адпаведнікаў у іншых мовах свету? У мовазнаўстве такія словы маюць адмысловую назву — лінгвакультурэма. У новай кнізе серыі «Вялікая энцыклапедыя маленькага прафесара» сабраныя якраз такія словы і паняцці. Праз мову лягчэй зразумець традыцыі, характар і памкненні беларусаў, адказаць на пытанне, што было важным для нашых продкаў і значным у паўсядзённым жыцці, і такім чынам паглыбіць веды пра родную краіну і яе народ.

Асаблівасці традыцыйнага жыцця беларусаў, іх гаспадарчай і культурнай дзейнасці, як у люстэрку, адбіліся ў беларускай мове, прымаўках і прыказках, вуснай народнай творчасці, творах пісьменнікаў. Выданне праз беларускія словы і іх азначэнні расказвае, як жылі нашы продкі некалькі стагоддзяў таму, як ставіліся да прыроды і Сусвету, як вялі гаспадарку, якімі былі іх уяўленні аб навакольным свеце.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1:

- капитальное строение, инв. № 443/С-13794 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – контора), общей площадью 239,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 14;
- капитальное строение, инв. № 443/С-13802 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад «Посудохозяйственный»), общей площадью 431,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 14/1;
- капитальное строение, инв. № 443/С-13789 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – котельная), общей площадью 164,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 14/2;
- капитальное строение, инв. № 443/С-13791 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад «Продовольственный»), общей площадью 1822,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 14/3;
- капитальное строение, инв. № 443/С-13798 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – бытовка), общей площадью 103,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 14/5;
- капитальное строение, инв. № 443/С-13795 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад «холодильник»), общей площадью 552,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 14/7;
- капитальное строение, инв. № 443/С-13786 (назначение – здание специализированное энергетики, наименование – трансформаторная), общей площадью 42,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 14/6.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425650100001002713 (целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий распределительных складов (для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции)), площадью 1,8181 га по адресу: г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 14.

Начальная цена продажи лота 455 280 р. (четыреста пятьдесят пять тысяч двести восемьдесят рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 45 528 руб. (сорок пять тысяч пятьсот двадцать восемь рублей)

Условия проведения аукциона:

1. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя.
2. Право собственности переходит к Покупателю после передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».
3. Документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.
4. Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1 % от конечной цены продажи объекта.

Условия оплаты – в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи

Продавец – Сморгонский филиал Гроднооблпотребобщества, 231000, г. Сморгонь, ул. Чапаева, 3, тел. 8-01592-247-82

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 20 октября 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 18 октября 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1:

- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-7508 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), общей площадью 956,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55;
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129622 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть), протяженностью 24,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, тепловая сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129623 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 57,6 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129625 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 190,3 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55;
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129624 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 159,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;
- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129627 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 26,8 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55;
- сеть энергоснабжения;
- оборудование: вагончик строительный, комплект регулирования температуры, набор мебели, насос Грунфос УРС24*40, охранно-пожарная сигнализация, павильон из металлоконструкций, регулятор распределения тепловой энергии, регулятор расхода теплоэнергии МИР 9701, система видеонаблюдения, система пожарной сигнализации; теплосчетчик ТЭМ-104 Ду-15; торговое оборудование (стеллаж, стол для торговли); торговый павильон (5 шт.); торговый павильон 3,2 м (2 торговых места 1,6*1,6); кондиционер настенный (2 шт.); лифт грузовой; пожарная сигнализация; холодильная камера GOLD; холодильная камера склад.

Лот 1 имеет обременения со стороны третьих лиц в виде аренды с собственниками павильонов и мест для торговли; прохождение по территории рынка теплотрассы к зданию ООО «Фирма Мока», на которой расположены павильоны и роллеты, в том числе находящиеся в собственности арендаторов

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 440100000002000488, площадью 0,8688 га (назначение – эксплуатация и обслуживание Грандичского рынка), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55

Начальная цена продажи – 3 261 636 руб. (три миллиона двести шестьдесят одна тысяча шестьсот тридцать шесть рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 326 163 руб. (триста двадцать шесть тысяч сто шестьдесят три рубля)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Гродненское областное потребительское общество Филиал «Центральный рынок», 230025, г. Гродно, ул. Полиграфистов, тел. 62-45-60

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 21 октября 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 19 октября 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении 1 октября 2021 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

**ЛОТ № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 342/D-213502 площадью 902,5 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – помещение № 3. **Адрес:** Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, м-н Первомайский, 3-140.
**Начальная цена продажи с учетом НДС: 732 226,09** бел. рублей. **Задаток (10 %) с учетом НДС: 73 222,61** бел. рублей

**Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона**

**Информация о земельном участке:** кадастровый номер 325050100002000591, площадь 0,3858 га; назначение – земельный участок для обслуживания и содержания многоквартирного жилого дома со встроенными помещениями (доля в праве 142/1000)

**Дополнительные условия:** заключены договора аренды: ООО «Фикс Прайс Запад» – до 21.05.2023 г.; ИП Кучеров Вячеслав Петрович – до 04.07.2022 г.; ЗАО «Медфарм» – до 17.04.2022 г.; имеются места общего пользования 75/100 долей (электрощитовая и теплоузел)

**Продавец: ОАО «Табаквинторг»**, г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Контактный телефон +375 29 334-04-60 – Королёва Анна Васильевна, +375 44 599-02-90 – главный инженер Денисов Олег Викторович.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581000000933 ОАО»Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 30.09.2021 г. в 17.00.**

